Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 97 (6979)

ЧАЦВЕР 24 КРАСАВІКА 1941 г.

ЦАНА 15 КАП.

Сёння ў нумары:

Прыём у Крэмлі ўдзельнікаў дэкады таджыкскага мастацтва. На прыёме прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Л. П. Берыя, Н. М. Швернік, Н. А. Вазнесенскі, А. С. Шчэрбакоў, Г. М. Маленкоў.

Трэці палёт у высокія шыроты Арктыкі.

Перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ: Г. Клябанаў — У комуністаў беластоцкага тэкстыльнага камбіната. З. Ларысаў — На сходзе партэрганізацыі швейнага гіганта.

АРТЫКУЛЫ: Б. Н. Папоў, С. А. Нехай —Скарыстаць кожнага спецыяліста па назначэнню. І. Новік — Палі падсыхаюць, а сеяць не спяшаюцца. Т. Прасмыцкі — Сяўбу правесці быстра і добра.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ. А. Мінькоў — Каштоўны дапаможнік настаўніку.

ЗА РУБЯЖОМ: Вайна ў Еўропе і Афрыцы. (Дзённік ваенных дзеянняў). Прыбыццё Мацуока ў Токіо. Імператар Японіі прыняў Мацуока. Прыём Гітлерам Чыано. Павелічэнне колькасці амерыканскай арміі. Цудэрос — прэм'ер-міністр Грэцыі. Харчовыя затрудненні ў Венгрыі.

Сеяць хутка і высокаякасна

Беларусь уступіла ў паласу масавай сяўбы. Следам за паўднёвымі раёнамі Палескай, Гомельскай, Пінскай і Брэсцкай абласцей палявыя работы пачаліся на Магілеўшчыне, Віцебшчыне. Паводле даных Наркамзема БССР, на 20 красавіка калгасы і аднаасобныя гаспадаркі рэспублікі засеялі яравымі культурамі 68.733 гектары.

Першыя дні палявых работ паказваюць, што калгаснае сялянства, узброенае гістарычнымі рашэннямі Сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі і Совета Народных Камісараў Саюза ССР аб дадатковай аплаце працы за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і аб асушэнні беларускіх балот, дружна, з вялікім узлётам выйшла на палі.

Надышоў рашаючы этап у барацьбе за высокі, сталінскі ўраджай, за выкананне задачы, пастаўленай XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй, — даць краіне ў гэтым годзе 7 мільярдаў 900 мільёнаў пудоў зярна. Правесці сяўбу хутка, арганізавана, на высокім агратэхнічным узроўні, лабіцца перавыкнання дзяржаўных заданняў па ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур — да гэтага накіраваны зараз усе імкненні калгасных мас.

Спісныя тэрміны сяўбы і высокая агратэхніка маюць важнейшае значэнне ў барацьбе за атрыманне высокага ўраджаю. Перадавыя калгасы гэта добра ўлічваюць. Правільна арганізаваўшы працу, умела расставіўшы людзей на полі, спалучаючы каня і трактар, яны паспяхова праводзяць сяўбу. За 5 рабочых дзён кончылі сяўбу ранніх яравых калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны будаўнік» Даманавіцкага раёна. Змагаючыся за высокі ўраджай, яны засеялі яравыя на добра ўгноенай глебе яравізаваным і пратручаным насеннем. У гэтым калгасе праяўляюцца выключныя клопаты і аб высокім ураджаі азімых культур. Увесь пасеў азімых прабаранаван, праведзена падкорма.

Паспяхова сеюць і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны араты» Хойніцкага раёна. Рабочы дзень у гэтым калгасе пачынаецца ў 5—6 гадзін раніцы і канчаецца з заходам сонца. Добрая расстаноўка рабочай сілы, умапаванне працоўнай дысцыпліны забяспечылі павышэнне прадукцыйнасці працы. Большасць калгаснікаў па палявых работах сістэматычна перавыконвае нормы выпрацоўкі. Калгас праводзіць сяўбу выключна радковымі сеялкамі на добра апрацаванай і ўгноенай глебе.

Але не ўсюды так пастаўлена справа. Першыя дні палявых работ паказалі, што ў асобных месцах няма большэвіцкіх клопатаў аб высокім ураджаі. Перадавікі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі сваім вопытам даказалі, што адной з важнейшых умоў павышэння ўраджайнасці з'яўляецца накапленне ў глебе дастатковай колькасці вільгаці. Барацьба за вільгаць ёсць барацьба за высокі ўраджай.

Выходзячы з гэтага, перадавікі ранняй вясной праводзяць баранаванне зяблева, увесь час утрымліваюць верхні слой глебы ў рыхлым стане.

Сігналы з Ельскага і Хойніцкага раёнаў Палескай вобласці папярэджаюць, што ў многіх калгасах не вядзецца барацьба за захаванне вільгаці. Тут не праводзіцца веснавое баранаванне зяблева, у калгасах дапускаюць улятучванне вільгаці і перасыханне глебы. У радзе месц назіраюцца факты ігнаравання перадавой агратэхнікі: сяўбу праводзяць уручную, нізкаякасным насеннем, у дрэнна апрацаваную і незапраўленую ўгнаеннямі глебу. Напрыклад, у калгасе «Перамога соцыялізма» Хойніцкага раёна сеюць неканцыйным і непратручаным насеннем, не скарыстоўваюць радковых сеялак. У калгасе «Большэвік» Ельскага раёна ёсць свая спраўная сеялка. Але праўленне калгаса не жадае яе скарыстаць, і сее уручную. Якасці палявых работ зусім недастаткова ўвагі ўдзяляюць Ельскі і Хойніцкі райкомы партыі і выканкомы райсоветаў. Яны чамусьці міраццa з фактамі масавых парушэнняў агратэхнікі ў калгасах.

Для таго, каб атрымаць высокі ўраджай, трэба правесці веснавую сяўбу ў самыя спісныя тэрміны, прымяніць на калгасных палях увесь комплекс перадавой агратэхнікі, шырока скарыстаць вопыт перадавікоў соцыялістычнага земляробства — удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Трэба на поўную магутнасць скарыстаць усе сеялкі МТС і калгасаў. Калгасныя палі павінны быць засеяны толькі высокаякасным насеннем. Пад пасевы неабходна ўнесці дастатковую колькасць угнаення. Для гэтай мэты трэба скарыстаць усе ўнутраныя рэзервы мясцовых угнаенняў і поўнасцю вывезці мінеральнае ўгнаенне са складаў Белсельгасхімснаба.

Зусім нецярпімая з'ява, калі датэтуль у многіх раёнах на складах ляжаць сотні тон мінеральных угнаенняў, прызначаных пад яравы клін. У адным толькі Барысаўскім раёне яшчэ не вывезена больш 200 тон каштоўнага мінеральнага ўгнаення. Незразумела, чаму Барысаўскі райком партыі, выканком райсовета і райземаддзел не прымаюць рашучых мер, каб вывезці мінеральнае ўгнаенне са складаў на калгасныя палі.

Партыйныя і совецкія арганізацыі, зямельныя органы рэспублікі павінны звярнуць асаблівую ўвагу на высокаякасную сяўбу і павышэнне ўраджайнасці асноўных тэхнічных культур Беларусі — ільну і кок-сагыза. Для ільну і кок-сагыза павінны быць адведзены самыя лепшыя папярэднікі. Гэта, безумоўна, не зменшае адказнасці за павышэнне ўраджайнасці астатніх культур.

Выключна вялікая і адказная роля агранамаў у павышэнні ўраджайнасці калгасных палёў. Партыя і ўрад аказваюць ім вялікае давер'е. Яны павінны нястомна прапагандыраваць і ўнядраць у калгасную вытворчасць перадавую агратэхніку, вопыт стаханаўцаў соцыялістычных палёў, аказваць калгасам усямерную дапамогу ў барацьбе за высокі ўраджай.

Зараз, калі ў рэспубліцы разгортваецца масавая сяўба, месца агранамаў не ў кабінетах райземаддзелаў і МТС, а на калгасных палях—там, дзе вырашаецца лёс высокага ўраджаю.

Адказны экзамен на веснавой сяўбе трымаюць кіраўнікі нашых машынна-трактарных станцый. Партыя чакае ад іх большэвіцкай арганізацыі работы трактарнага парка. На XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі адзначалася, што адным з буйнейшых недахопаў у сельскай гаспадарцы з'яўляецца незадавальняючае скарыстанне трактараў. Некаторыя кіраўнікі МТС не зрабілі з гэтага неабходных высноў. Зусім непадрыхтаванай уступіла ў веснавую сяўбу Жлобінская МТС. Пачаліся палявыя работы, а МТС яшчэ не закончыла рамонт трох трактараў. З першых-жа дзён работы ў полі трактары з прычыны нізкаякаснага рамонту пачалі выходзіць са строю.

Не намнога лепшае становішча і ў Лоеўскай МТС. Тут амаравілі па ўчастку няпоўнасцю адрамантаваныя трактары, і зараз трактарысты на полі, ў баразне вымушаны рабіць рамонт. У першыя-жа дні работ у калгасе імені Сталіна выйшлі са строю два трактары Бауманскай МТС. Слуцкага раёна. Усе гэтыя факты павінны прыкаваць увагу райкомаў партыі і выканкомаў райсоветаў да работы машынна-трактарных станцый.

Веснавая сяўба гэтага года супадае з пачаткам ажыццяўлення велічнай сталінскай праграмы ператварэння беларускіх балот у квітнеючыя калгасныя палі і сенажаці. Важнейшая задача партыйных, совецкіх арганізацый і зямельных органаў раёнаў і абласцей — мабілізаваць калгаснае сялянства на большэвіцкае правядзенне сяўбы ў самыя спісныя тэрміны і гэтым забяспечыць дружны і масавы выхад калгаснікаў на асушку балот.

ПРЫЁМ У КРЭМЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДЭКАДЫ ТАДЖЫКСКАГА МАСТАЦТВА

На прыёме прысутнічалі таварышы І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, М. І. КАЛІНІН, Л. М. КАГАНОВІЧ, А. А. АНДРЭЕЎ, А. І. МІКАЯН, А. А. ЖДАНАЎ, Л. П. БЕРЫЯ, Н. М. ШВЕРНІК, Н. А. ВАЗНЕСЕНСКІ, А. С. ШЧЭРБАКОЎ, Г. М. МАЛЕНКОЎ

22 красавіка вечарам у Крэмлі адбыўся прыём удзельнікаў толькі што закончыўшайся дэкады таджыкскага мастацтва, наладжаны Камітэтам па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР.

Ў 19 гадзінам у Георгіеўскім зале Вялікага Крэмлёўскага палаца сабраліся работнікі мастацтва Таджыкскай ССР, члены ЦК ВКП(б), Народныя Камісары, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета РСФСР, Героі Совецкага Саюза, Героі Соцыялістычнай Працы, прадстаўнікі вышэйшага камандавання Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, лаўрэаты Сталінскай прэміі—вядомыя дзеячы навукі, тэхнікі, мастацтва і літаратуры.

Тут прысутнічаюць таварышы Тімашэнка, Дзімітраў, Будзённы, Буганін, Вышынскі, Мехліс, Первухін, Касыгін, Кузнецоў, Бадаеў, Лазоўскі, Тюленеў, Пратапопаў, Курбанаў, Шагадаеў, Зверэў, Ефрэмаў, Акімаў, Яраслаўскі, Паскрэбышаў, Паспелаў, Горкін, Папанін, Молакаў, Міхайлаў, Пронін, Папоў і іншыя.

Раздаюцца грамавыя воплескі, калі ў Георгіеўскі зал уваходзяць таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Л. П. Берыя, Н. М. Швернік, Н. А. Вазнесенскі, А. С. Шчэрбакоў, Г. М. Маленкоў.

Усе ўстаюць. На працягу некалькіх мінут прысутнічаючыя радасна вітаюць таварыша Сталіна і яго саратнікаў.

З кароткай прамовай выступае старшыня Камітэта па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР тав. М. Б. Храпчанка.

— Пачуццё глыбокага хвалявання і радасці, — гаворыць ён, — перажываюць работнікі мастацтваў нашай краіны ў гэтыя дні. Дэкада таджыкскага мастацтва, якая закончылася, прыцягнула да сябе ўвагу найшырэйшых кругоў совецкай грамадскасці. Работнікі мастацтваў совецкага Таджыкістана паказалі сваё выдатнае майстэрства, прадэманстравалі красу і багацце культуры таджыкскага народа.

Заканчэнне дэкады таджыкскага мастацтва супала з другой знамянальнай падзеяй у культурным жыцці краіны—уручэннем дыпломаў лаўрэатам Сталінскай прэміі. Сёння ўдзельнікі дэкады таджыкскага мастацтва і лаўрэаты Сталінскай прэміі сабраліся ў Крэмлёўскім палацы разам з кіраўнікамі партыі і ўрада, разам з таварышам Сталіным.

Дзякуючы клопатам партыі і ўрада і асабіста вялікага Сталіна гігантска распе і мацнее мастацтва і культура ўсіх народаў Совецкага Саюза; расцвіло мастацтва Таджыкскай рэспублікі.

Тав. Храпчанка абвяшчае здравіцу за выдатнае мастацтва совецкага Таджыкістана, за ўдзельнікаў дэкады таджыкскага мастацтва, за лаўрэатаў Сталінскай прэміі, за натхніцеля ўсіх перамог соцыялізма—вялікага друга совецкага мастацтва таварыша Сталіна.

У зале ўзнікае авацыя ў чэсць таварыша Сталіна. Некалькі мінут прадаўжаюцца воплескі. Усе прысутныя вітаюць любімага правадыра, настаўніка і друга.

Слова атрымлівае заслужаны артыст Таджыкскай ССР Мухамеджан Касымаў.

— У гэтыя дні, — гаворыць тав. Касымаў — таджыкскі народ перажывае велізарную радасць. Гэта радасць выклікана вынікамі дэкады таджыкскага мастацтва ў Маскве.

Работнікі мастацтва Таджыкістана, натхнёныя цёплым прыёмам грамадскасці сталіцы нашай радзімы і той вялікай увагаю, якая аказана нам кіраўнікамі партыі і ўрада,—будуць яшчэ больш упорна працаваць над сабой, будуць лепш скарыстоўваць неабмежаваныя крыніцы многавяковай таджыкскай культуры, паказваць у мастацтве заможнае, шчаслівае жыццё таджыкскага народа.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Шчыра жадаем Вам здароўя, яшчэ многіх і многіх год жыцця на страх ворагам і на радасць працоўных мас усяго свету.

Раздаюцца радасныя воклічы прывітанняў у чэсць таварыша Сталіна. Пад зводамі зала доўга не змаўкае «ура».

На роднай мове гаворыць прамову заслужаная артыстка Таджыкскай ССР Туфа Фазылава. Яна гаворыць аб росквіце культуры і мастацтва таджыкскага народа, аб поспехах майстроў мастацтваў, якіх яны дабіліся дзякуючы пастаянным клопатам і дапамозе совецкага ўрада на чале з Вячэславам Міхайлавічам Молатавым.

Тав. Фазылава абвяшчае здравіцу ў чэсць любімага кіраўніка совецкага ўрада таварыша Молатава. Гарачымі апладысментамі вітаюць прысутныя бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна—Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

З вялікім уздымам выступае заслужаная артыстка Таджыкскай ССР Рэна Галібава.

Па яе прапанове прысутныя цёпла вітаюць Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Міхаіла Іванавіча Калініна.

Слова бярэ Старшыня Совета Народных Камісараў СССР таварыш В. М. Молатаў.

— Сёння наша свята ў чэсць новых выдатных дасягненняў совецкага Таджыкістана, а значыць і ўсяго Совецкага Саюза, — гаворыць таварыш Молатаў.— Мы радасна сустракаем тут гэты дзень, сустракаем разам з нашымі выдатнымі людзьмі,—лаўрэатамі Сталінскіх прэмій у галіне навукі, тэхнікі, вынаходніцтва, мастацтва і літаратуры. Мы знаем, што сталінскія лаўрэаты 1941 года праклалі шлях для далейшых слаўных дасягненняў у развіцці навукі, тэхнікі, мастацтва і літаратуры.

Я абвяшчаю тост за здароўе сталінскіх лаўрэатаў. Няхай жывуць сталінскія лаўрэаты 1941 года!

За здароўе таварыша Сталіна—ура!

Бурнай, лікуючай авацыяй сустракаецца здравіца, абвешчаная таварышам Молатавым. У адзіным парыве падымаюцца ўсе з сваіх месц. На таджыкскай і рускай мовах на працягу многіх мінут гучаць прывітальныя воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Вялікаму Сталіну — ура!» Грамавое «ура» доўга не змаўкае пад зводамі Георгіеўскага зала.

Авацыя ўзнікае з новай выключнай сілай, калі В. М. Молатаў аб'яўляе, што слова мае таварыш Сталін. Лікаванню няма граніц. Позіркі ўсіх прысутных звяртаюцца да таварыша Сталіна. Воплескі доўга не даюць яму пачаць сваю прамову.

Таварыш Сталін прапікнённа гаворыць аб вялікім Леніне, які стварыў большэвіцкую партыю, арганізаваў Саюз народаў свабоднай краіны, прывычыў бераты гэты вялікі Саюз. Затым таварыш Сталін паднімае тост за здароўе і працвітанне таджыкскага народа, за тое, каб усямерна развіваліся яго культура і мастацтва.

Заключныя словы прамовы таварыша Сталіна выклікаюць поўную захаплення авацыю. Усе падымаюцца ў адзіным парыве. З велізарнай сілай грымяць воплескі. Многакратна раздаюцца воклічы прывітанняў у чэсць вялікага правадыра, настаўніка і друга—таварыша Сталіна.

Для прысутнічаўшых на прыёме гасцей быў дан вялікі канцэрт.

Прыём прадаўжаўся некалькі гадзін. Таварыш Сталін, кіраўнікі партыі і ўрада цёпла развітваюцца з прысутнымі. І зноў раздаецца поўная захаплення авацыя ў чэсць таварыша Сталіна і яго саратнікаў. (ТАСС).

21 красавіка ў Камітэце па справах вышэйшай школы пры СНК СССР адбылося ўручэнне дыпломаў і прэмій лаўрэатам Сталінскай прэміі — работнікам навукі. На здымку (на пярэднім плане): акадэмік Т. Д. Лысенка (злева) і старшыня Камітэта па Сталінскіх прэміях у галіне навукі і вынаходніцтва акадэмік А. Н. Бах.

Фото В. Шароўскага. (Фотахроніка ТАСС).

ТРЭЦІ ПАЛЁТ У ВЫСОКІЯ ШЫРОТЫ АРКТЫКІ

Самалёт Чэравічнага стартаваў на поўнач

22 красавіка ў 19 гадзін 05 мінут па маскоўскаму часу высокашыротная паветраная экспедыцыя пакінула востраў Врангеля. У Маскве толькі наступалі прыцемкі, а там ужо была раніца 23 красавіка, калі самалёт «СССР Н-169», пілатыруемы І. І. Чэравічным, адарваўся ад аэрадрома і, зрабіўшы круг, узяў курс на поўнач — у глыб Арктыкі.

Стартуючы з вострава Врангеля ў трэці палёт, Чэравічны атрымаў заданне зрабіць пасадку на лёдавым полі ў раёне 80 градуса паўночнай шыраты і 170 градуса заходняй даўгаты (г. зн. у заходнім поўшар'і). Тут удзельнікам экспедыцыі прадстаіць правесці яшчэ рад навуковых назіранняў.

З моманту старта радыёты палярных станцый на астравах і ўзбярэжжы ўсходняга сектара Арктыкі вялі бесперапынае назіранне за работай радыё самалёта «СССР-Н-169».

Першае паведамленне аб вылеце Чэравічнага Галоўнае Упраўленне Паўночнага марскога шляху атрымала з мыса Чэлюскін праз некалькі мінут пасля старта.

У 19 гадзін 35 мінут з борта самалёта была прынята радыёграма:

«У 19.05 маскоўскага стартавалі курсам Норд у трэці маршрут. Чэравічны, Лібін».

У наступнай радыёграме Чэравічны і штурман Акуратаў паведамілі, што самалёт перасек 72-ю паралель. «СССР Н-169» ішоў на невялікай вышыні—140 метраў. «Лёд 10 балаў. Малыя палі са слядамі свежага спіскання. Таросістыя гряды. Усё ў парадку».—гаварылася ў радыёграме.

Трэці высокашыротны рэйс працякаў у больш цяжкіх умовах, чым першыя два. У 21 гадзіну 12 мінут самалёт падыходзіў да 74 паралелі. Чэравічны і Акуратаў радыявалі:

«Вышыня 200 метраў. Суцэльная воблачнасць. Лёд 10 балаў. Сустрэты першыя палі, пакуль з нязначным снежным пакровам. Відны вузкія разводдзі чыстай вады. Лёд вельмі таросісты. Усё ў парадку».

У наступнай радыёграме Чэравічны і Акуратаў паведамілі:

«У 22.10 маскоўскага—75 град. 10 мін. паўночнай шыраты, 176 град. заходняй даўгаты. Лёд 10 балаў. Многамільныя пакавыя палі з вузкімі разводдзямі, запятнутымі маладым лёдам. Ёсць палі, годныя для пасадак. Суцэльная воблачнасць. Вышыня 150 метраў. Усё ў парадку».

У 23 гадзіны 10 мінут паводле паведамлення экіпажа, «СССР Н-169» падыходзіў да 77-й паралелі. У гэтым раёне зноў былі выяўлены лежачыя палі, прыгодныя для пасадкі самалёта. У воблачнасці, закрываўшай неба, паявіліся разрывы. Палёт працякае добра.

САМАЛЁТ ЧЭРАВІЧНАГА У ЛАГЕРЫ № 3

БОРТ САМАЛЁТА «СССР Н-169», 23 красавіка. **(Па радыё).** 02 гадзіны 10 мінут. Суцэльная воблачнасць. Шукаем месца пасадкі. Упералзе прасветы. Усё ў парадку. Чэравічны, Акуратаў.

***

БОРТ САМАЛЁТА «СССР Н-169», 23 красавіка. **(Па радыё).** У 04 гадзіны 05 мінут зрабілі пасадку. Аглядаем крыгу. Макараў.

(ТАСС).

ПЕРАДМАЙСКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Працуючы па метаду знатных машыністаў нашай краіны т. Папавіна і Луніна, машыніст Мінскага дэпо комуніст тав. Баброўскі Н. сумесна са сваімі напарнікамі машыністамі тт. Клембоўскім, Несцяровічам і Заянчкоўскім, у падарунак пролетарскаму святу Першага мая рашуў зрабіць пад'ёмачны рамонт паравоза «ОБ» сваімі сіламі.

Не гледзячы на выключную складанасць пад'ёмачнага рамонту, пры якім робіцца замена калёсных пар, пераліўка буксавых і дышлавых падшыпнікаў, рамонт інжэктараў і т. д., брыгада тав. Баброўскага добра справілася з адказнай задачай. Брыгада сама выканала поўны рамонт дышлаў, падгонку буксавых падшыпнікаў, рамонт поршняў са зменай кольцаў, рамонт арматуры і т. д. На рамонце паравоза зэканомлена звыш 2 тысяч рублёў.

У бліжэйшы час тав. Баброўскі прачытае ў дэпо для машыністаў лекцыю аб першым вопыце пад'ёмачнага рамонту сіламі саміх паравозных брыгад.

***

Калектыў мінскага скурзавода «Большэвік» рыхтуе дастойную сустрэчу святу Першага мая. За 20 дзён красавіка завод выканаў праграму на 101,2 процанта. Упераадзе ідзе брыгада струталяў тав. Шамеса і брыгада чысцільшчыкаў тав. Канарскага (II хромавы цэх), якія перавыконваюць нормы ў паўтара раза. Брыгада шпальтоўшчыкаў тав. Багарада з першага хромавага цэха за 20 дзён красавіка выканала норму на 140,8 процанта.

Днямі на заводзе пачалі працаваць дзве новыя механізаваныя сушылкі. Гэта дасць магчымасць павялічыць выпуск прадукцыі на 5 процантаў.

***

МАГІЛЕЎ, 23 красавіка. Торфзавод «Хвойна-масток» (Магілеўскі раён) пачаў сезон 15 красавіка. З першых-жа дзён на заводзе ўстаноўлен графік, што дало магчымасць дабіцца выканання дзённага плана на 150—170 процантаў.

Усе брыгады і звенні спаборнічаюць на дастойную сустрэчу першамайскага свята. Узоры высокай прадукцыйнасці працы паказвае брыгада сцельшчыкаў тав. Кулінкова. Пры норме ў 7 тысяч торфацаглін яна рассцілае 13,5 тысячы. Брыгады тт. Бародзіча і Клепчыкава рассцілаюць па 11 тысяч торфацаглін. На рэзцы торфу працуе 15 звенняў. Звяно Марыі Ганчаровай пры норме ў 2860 наразае да 4 тысяч торфацаглін.

***

ЛІДА, 23 красавіка. **(Па тэлефону).** Рыхтуючы дастойную сустрэчу вялікаму пролетарскаму святу Першага мая, рабочы калектыў фабрыкі «Ардаль» заваяваў новую перамогу. У вядучым зборачным цаху ўведзен пагадзінны графік. Праз кожную гадзіну з аднаго канвейера знімаецца па 187 пар гумавага абутку. У дзень фабрыка выпускае 6000 пар гумавага абутку замест 4500 па плану.

За час спаборніцтва вырас вялікі атрад стаханаўцаў. Зараз іх налічваецца каля 400 чалавек. Лепшыя стаханаўцы тт. Семашка, Жыжэмская і Вайтовіч выконваюць дзённае заданне на 250—280 процантаў.

Планамерная, рытмічная работа на аснове соцыялістычнага спаборніцтва забяспечыла датэрміновае выкананне праграмы. 21 красавіка фабрыка выканала свой чатырохмесячны план.

Працоўныя Гродна рыхтуюцца да свята

ГРОДНА. (БЕЛТА). З вялікай радасцю рыхтуюцца працоўныя горада да першамайскага свята. На прадпрыемствах, ва ўстановах у поўным разгары работа па афармленню калон дэманстрантаў. Вуліцы і плошчы горада набываюць святочны выгляд. На плошчах імені Леніна і Совецкай устанаўліваюцца манументальныя скульптуры правадыроў рэвалюцыі Леніна і Сталіна.

Да свята піонеры і школьнікі горада атрымліваюць выдатны падарунак — Дом піонераў.

ШАХМАТНЫ МАТЧ-ТУРНІР

Учора іграўся 17-ты тур шахматнага матч-турніра на званне абсалютнага чэмпіёна СССР.

У вострай барацьбе працякала партыя лідэра турніра гросмейстара Батвініка з гросмейстарам Ліліенталем. Батвінік (чорнымі) атрымаў перавагу, якую метадычна ўзмацняў. Ліліенталь упорна абараняўся, але цаной страты пешкі. Партыя адкладзена з перавагай у Батвініка.

Смыслоў пасіўна разыграў дэбют супроць Керэса, што гросмейстар не прамінуў скарыстаць. Партыя адкладзена ў лепшым становішчы для Керэса.

Балеслаўскі і Бандарэўскі размянялі ўсе фігуры і к 40-му ходу праціўнікам нічога не аставалася, як згадзіцца на нічыю, што і было зафіксіравана.

Сёння іграецца 18-ты тур. Асталіся толькі тры апошнія сустрэчы, якія, аднак, ужо не могуць пахіснуць становішча лідэра турніра гросмейстара ордэваноспа Батвініка. Пытанне толькі ў тым, на колькі ачкоў ён апярэдзіць наступнага і хто будзе гэтым наступным. Сёння Батвінік сустракаецца з гросмейстарам Керэсам.

ШАХМАТНЫ І ШАШАЧНЫ ЧЭМПІЯНАТЫ БССР

Учора ў восьмым туры шахматнага чэмпіяната зноў адкладзены тры партыі. Такой колькасці незакончаных за пяць гадзін ігры партый не было яшчэ ні ў адным чэмпіянаце БССР, што сведчыць аб вельмі ўпорнай барацьбе большасці ўдзельнікаў. Толькі адзін майстар Верасаў не меў яшчэ адкладзеных партый. Учора ён хутка закончыў ігру, даказаўшы памылковасць дэбютных манеўраў Серабрыйскага. Шпігельмахер выйграў у Майзеля, Брэйтман—у Жудро. Райнфельд у лепшай пазіцыі з лішняй пешкай сыграў лёгкадумна, папаў пад «мёртвую звязку» і вымушан быў замест выйгрышу здаць партыю Камісаруку.

Пасля пройгрышу ў першых двух турах шашачнага чэмпіяната майстар Гардон ужо амаль зусім не мае магчымасці змагацца за званне чэмпіёна рэспублікі, якое ён трымаў 13 год падрад і «уступіў» Грушэцкаму (Віцебск) у мінулым чэмпіянаце (1939 г.). Пасля чатырох тураў лідэрствуе Грушэцкі — 3½ з 4. За ім Гарадзецкі—3 з 4, Ізэльсон—2½ з 4 і Канішчыкер—3½ з 5.

Сёння чарговыя туры іграюцца з 18 да 23 гадзін.

У шахматным турніры сёння цікавая сустрэча двух майстраў—Сіліча і Верасава (Сіліч іграе белымі).

У апошнюю гадзіну

ПРЫБЫЦЦЁ МАЦУОКА Ў ТОКІО

ТОКІО, 23 красавіка. (ТАСС). Учора ў 16 гадзін 50 мінут па мясцоваму часу японскі міністр замежных спраў Мацуока прыбыў у Токіо. Па аэрадроме Мацуока сустракалі прэм'ер-міністр Японіі Каноэ, паўпрэд СССР у Японіі т. Сметанін, германскі пасол От, італьянскі пасол Індэлі, рад іншых прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса, супрацоўнікі пасольстваў, замежныя і японскія карэспандэнты і др. З аэрадрома Мацуока накіраваўся ў афіцыяльную рэзідэнцыю Каноэ.

Імператар Японіі прыняў Мацуока

ТОКІО, 23 красавіка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Домей Цусін, учора ў 19 гадзін 20 мінут Мацуока быў прынят імператарам. Мацуока падрабязна далажыў імператару аб становішчы ў Еўропе. Аудыенцыя прадаўжалася звыш гадзіны.

ПЕРАЕЗД ГРЭЧАСКАГА ЎРАДА НА ВОСТРАЎ КРЫТ

ЛОНДАН, 23 красавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр з Афін, грэчаскі Кароль Георг звярнуўся да насельніцтва з абозвай, у якой указвае, што грэчаскі ўрад рашыў пакінуць Афіны і перанесці сталіцу на востраў Крыт, дзе ён зможа прадаўжаць барацьбу.

НАСТУПЛЕННЕ АНГЛІЙСКІХ ВОЙСК У ЛІВІІ

НЬЮ-ЙОРК, 23 красавіка. (ТАСС). Каірскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, спасылаючыся на добра інфармаваныя кругі, перадае, што англійскія войскі перайшлі ў наступленне на лівійскім фронце.

УРУЧЭННЕ ВЕРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ ПАЎПРЭДАМ СССР У ФІНЛЯНДЫІ

ХЕЛЬСІНКІ. 23 красавіка. (ТАСС). Як перадае фінляндскае тэлеграфнае агенцтва, прэзідэнт Фінляндыі прыняў сёння паўпрэда СССР у Фінляндыі Орлова, уручыўшага свае верыцельныя граматы.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

У КОМУНІСТАЎ БЕЛАСТОЦКАГА ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА

4-ты тэкстыльны камбінат Беластока ў 1940 годзе працаваў дрэнна. План па гатовай прадукцыі быў выканан на 91,1 проц., па валавой прадукцыі—на 93,5 проц. Меў месца значны перарасход сыравіны.

Зусім натуральна, што партыйная арганізацыя першачарговай задачай сваёй паставіла барацьбу за ліквідацыю адставання камбіната. З гэтага і пачала свой даклад на справаздачна-выбарным сходзе сакратар партарганізацыі тав. Ваверняк.

Комуністы падымалі рад вытворчых пытанняў. У разультаце быў абсталяван новы 4-ты корпус прадзільнага цэха, нанова абсталяван фарбавальна-апрэтурны цэх, размешчан у новым корпусе ткацкі цэх. Усё гэта паленшыла ўмовы працы і, здавалася, стварыла прадпасылкі для выканання плана. А план усё-ж не выконваўся. Прычыны таіліся ў павярхоўным агульным кіраўніцтве і ў слабым кантролі дзейнасці адміністрацыі.

Раз'яснене і азнаямленне рабочых з дакладамі і рашэннямі, прынятымі на XVIII канферэнцыі, падняла палітычную і вытворчую актыўнасць рабочых. Павялічыўся лік стаханаўцаў—з 71 у мінулым годзе да 110 у сакавіку гэтага года. Лепшыя стаханаўцы камбіната тт. Пылкоўская, Жукоўская, Карповіч, Здралоўская выконваюць нормы на 114 проц.

План першага квартала 1941 года выкананы па гатовай прадукцыі на 104,9 проц., па прадзенню—на 114,5 проц., на ткацтву—на 103,9 проц., па валавой прадукцыі—на 112,5 проц.; перавыкананы план па сортнасці.

І тым не менш у рабоце камбіната ёсць сур'ёзныя недахопы. Няпоўнасцю ўведзен і выконваецца сутачны графік. Ёсць прастоі. Ткацкі цэх 14 красавіка прастаяў цэлую змену з-за адсутнасці пражы. Прадзільны і ткацкі цэхі ў першай палавіне красавіка графік не выконвалі.

Вельмі нездавальняюча працуе ўчотны апарат. Асабліва дрэнна наладжан нізавы ўлік, з прычыны чаго няма аналіза сабекошту прадукцыі. Усё яшчэ вялікі процант угару (адыходаў), а гэта ўрэшце вядзе да недастачы сыравіны, да прастояў, а значыць, і да недадачы метража па норме сыравіны. Дрэнна працуе аддзел снабжэння. З-за адсутнасці соды, якая знаходзілася на станцыі, 18 красавіка прастаяла адна змена фарбавальна-апрэтурнага цэха.

Вельмі робка тав. Ваверняк ускрывала недахопы партыйна-масавай работы. На месцы ёсць агіткалектыў, які аб'ядноў 40 агітатараў. Ім праводзілася вялікая работа, асабліва ў перыяд выбараў у мясцовыя советы. У апошні час колькасць агітатараў зменшылася да 30, але і яны не ўцягнуты ў штодзённую работу. Недастаткова вядзецца работа па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны. За першы квартал 1941 года меў месца 31 выпадак парушэння працоўнай дысцыпліны.

Выступіўшыя ў спрэчках комуністы тт. Анатольева і Зайцаў рэзка крытыкавалі сакратара партарганізацыі за недастатковую патрабавальнасць да комуністаў у выкананні даваемых ім даручэнняў. Тав. Зайцаў гаварыў, што ні на адным з партыйных сходаў не правяралі выкананне прынятых палярэднім сходам рашэнняў.

Тав. Сытоў гаварыў аб недастатковай рабоце са стаханаўцамі. Стаханаўскі рух адыграў выключную ролю ў выкананні вытворчых норм рабочымі. Аднак вопыт лепшых стаханаўцаў недастаткова перадаўся астатнім рабочым.

Зусім правільна вылучаючы лепшых рабочых на кіруючыя пасады (вылучана 18 чалавек), партыйная арганізацыя не заўсёды аказвала ім штодзённую дапамогу ў рабоце.

Работа сакратара партарганізацыі прызнана здавальняючай. Сакратаром партыйнай арганізацыі выбран тав. Сытоў, намеснікам сакратара — тав. Бязломнікаў.

Г. КЛЯБАНАЎ.

Гурток настаўнікаў 1-й сярэдняй польскай школы г. Беластока за вывучэннем гісторыі партыі. Вядзе заняткі дырэктар школы Н. А. Канавалава.

Фото Б. Дынкіна.

Хроніка выбараў

На высокім ідэйна-палітычным узроўні, пры вялікай актыўнасці комуністаў праходзяць справаздачна-выбарныя сходы ў партыйных арганізацыях Віцебскай вобласці. Справаздачныя сходы прайшлі ў 947 первічных партыйных арганізацыях, што складае 61 проц. да агульнай колькасці первічных партарганізацый вобласці.

На сходах прысутнічала 5063 члены і кандыдаты партыі, або 86 проц. да іх агульнай колькасці. Выступіла ў спрэчках 3390 чалавек—67 проц. да агульнага ліку прысутных комуністаў.

У 42 партыйных арганізацыях работа прызнана нездавальняючай. Упершыню выбрана сакратарамі партыйных арганізацый 151 чалавек.

Комуністы ў сваіх выступленнях востра крытыкавалі недахопы ў рабоце партыйных арганізацый, уносілі рад каштоўных прапаноў, накіраваных на хутчэйшую рэалізацыю рашэнняў XVIII партыйнай канферэнцыі.

Асобныя кіраўнікі партыйных арганізацый несур'ёзна аднесліся да падрыхтоўкі сходаў.

З-за непадрыхтаванасці перанесен справаздачна-выбарны сход па Аршанскім ільнокамбінаце. Сход у партыйнай арганізацыі пякарні № 1 горада Віцебска, які павінен быў па плану адбыцца 12 красавіка, як дрэнна падрыхтаваны, быў перанесен райкомам на 18 красавіка. Аднак пры паўторнай праверцы, зробленай інструктарам абкома, выяўлена, што сход усё-ж не падрыхтаван і яго прышлося зноў адкласці.

У некаторых партыйных арганізацыях пры правядзенні сходаў дапушчаны памылкі. На сходзе цэхавай партыйнай арганізацыі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» ў прэзідыум схода быў выбран кандыдат партыі. На сходзе ў партыйнай арганізацыі Марлашэўскага сельсовета, Дубровенскага раёна, прадстаўнік райкома тав. Шэрсцянёў прымаў удзел у тайным галасаванні, не гледзячы на тое, што ён не знаходзіцца на ўчоце ў данай партыйнай арганізацыі. У некаторых партыйных арганізацыях прыняты няправільныя і блытаныя рашэнні. У пастанове справаздачна-выбарнага партыйнага схода гістарычнага музея запісана: «Выяўляць лепшых работнікаў, палітычна падрыхтаваных і апраўдваючых сябе на рабоце для ўцягнення іх у партыю». Акцябрскі райком алмяніў гэтае рашэнне, як няправільнае.

Усе гэтыя недахопы сведчаць аб тым, што асобныя райкомы партыі недастаткова кіруюць правядзеннем справаздачна-выбарных сходаў.

***

ВІЛЕЙКА. (Кар. «Звязды»). На 23 красавіка справаздачна-выбарныя сходы адбыліся ў 128 з 208 первічных партыйных арганізацыях вобласці. У большасці арганізацый сходы праходзяць па-дзелавому.

У 16 партыйных арганізацыях работа кіруючых партыйных органаў прызнана нездавальняючай. У 49 партарганізацыях выбраны новыя сакратары.

Недастатковая падрыхтоўка да справаздачна-выбарнай кампаніі праведзена ў радзе первічных арганізацый Свірскага раёна. У партыйных арганізацыях выканкома райсавета і апарата Ўпоўнаважанага Народнага камісарыята загатовак сходы адбыліся не ў вызначаныя дні.

Партыйная арганізацыя облмаслапрома па справаздачнаму дакладу прыняла няправільную пастанову, у якой абавязала дырэктара облмаслапрома тав. Маліна і яго намесніка тав. Ярашчука правесці рад арганізацыйных мерапрыемстваў. А як вядома, партарганізацыі ўстаноў не маюць права кантраляваць дзейнасць адміністрацыі. Бюро Вілейскага гаркома партыі адмяніла гэту пастанову і ўказала партыйнай арганізацыі на яе памылкі.

НА СХОДЗЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ШВЕЙНАГА ГІГАНТА

З налічваючыхся на віцебскай швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» 11 цэхавых партарганізацый работа чатырох прызнана нездавальняючай. 6 сакратароў былі забалатыраваны.

Гэтыя факты прывёў удзельнікам сходу сакратар партбюро фабрыкі тав. Матвееў. Яны гаварыць аб многім і ў першую чаргу аб тым, што з боку партыйнага бюро не было належнага кіраўніцтва цэхавымі партыйнымі арганізацыямі. Бюро само дрэнна займалася вытворчымі пытаннямі, а значыцца, нічога павучальнага не магло падказаць цэхавым партарганізацыям. Па заяве самога тав. Матвеева, многія рашэнні партбюро былі неканкрэтныя, амаль зусім адсутнічаў кантроль за выкананнем вынасімых рашэнняў.

Даную тав. Матвеевым характарыстыку работы партыйнага бюро поўнасцю пацвярджаюць справы фабрыкі. План 1940 года быў выкананы усяго на 86,9 проц.

Штурмаўшчына, саматужніцтва, грубыя парушэнні тэхналагічнага працэса—вось што характарызавала работу прадпрыемства ў 1940 годзе. Такія важныя вузлавыя пытанні, як якасць і асартымент прадукцыі, сабекошт, расходванне сыравіны і інш., выпалі з поля зроку партбюро і цэхавых партыйных арганізацый.

У бягучым годзе фабрыка пачала працаваць некалькі лепш. План першага квартала выкананы на 104,1 проц. Выкакана таксама заданне па зніжэнню сабекошту прадукцыі. Але ў рабоце цэхаў і ўчасткаў фабрыкі яшчэ і сёння ёсць рад істотных недахопаў. Іх з усёй вастрынёй ускрывалі комуністы ў сваіх выступленнях.

— Тое, што план першага квартала па валавой прадукцыі выкананы, — заявіў дырэктар фабрыкі тав. Мачалаў, — нас нікольні не павінна супакойваць. Мы яшчэ маем вялікія адхіленні ад запланіраванай сортнасці прадукцыі. 18 груп не выканалі нават колькасных паказальнікаў плана. 769 рабочых яшчэ і сёння не выконваюць норм выпрацоўкі. Мы не дабіліся патрэбнай рытмічнасці ў рабоце цэхаў і брыгад. Нам яшчэ многае трэба зрабіць, каб наладзіць чоткую работу фабрыкі.

Рад таварышоў—сакратары партарганізацый цэхаў №№ 3 і 4 тт. Эльбам і Білевіч, намеснік сакратара партбюро тав. Міхайлоўская і др.—заявілі, што з якасцю прадукцыі справа абстаіць усё яшчэ не добра. Паніжэнне сортнасці па асобных відах вырабаў (поўпаліто і інш.) дасягае 14 проц. Таварышы правільна заўважылі, што нізкая якасць прадукцыі ёсць галоўным чынам рэзультат парушэння тэхналагічнай дысцыпліны. Груба парушаецца тэхналагічны парадак у цэхах №№ 2 і 9, узначальваемых комуністамі.

Выступаўшыя комуністы адзначалі, што пераважная большасць майстроў фабрыкі не маюць належнай тэхнічнай падрыхтоўкі. А там, дзе адсутнічаюць элементарныя тэхнічныя веды,—парушаецца тэхналогія, атрымліваецца брак і заніжэнне сортнасці. Яркай ілюстрацыяй гэтаму можа быць лента майстра члена партыі тав. Завідоўскага (цэх № 4). Агульнаадукацыйны і тэхнічны ўзровень тав. Завідоўскага вельмі нізкі, і ўзначальваемая ім лента асабліва вызяляецца бескультур'ем, вялікай колькасцю бракаванай прадукцыі. У свой час партыйнае бюро вынесла рашэнне аб стварэнні на фабрыцы курсаў па павышэнню тэхнічных ведаў майстраў, але і па сённешні дзень гэта рашэнне не рэалізавана.

Аб парочным метадзе падбору кадраў майстраў гаварыў у сваім выступленні старшыня фабкома тав. Абезгауз.

— Вельмі часта, — гаворыць ён, — майстрамі назначаюцца людзі, якія ў мінулым былі зняты з гэтай пасады, як не справіўшыяся з работай (накшталт тав. Панаса), у той-жа час інжынерна-тэхнічныя кадры скарыстоўваюцца надзвычайна дрэнна. На фабрыцы ёсць 35 тэхнікаў, але з іх непасрэдна ў цэху, на вытворчасці працуюць толькі 2. Чаму мы не можам гэту тэхнічную сілу скарыстаць у якасці майстраў лент і ўчасткаў?

Усяго ў спрэчках выступіла 25 чалавек. Сакратаром партбюро выбран т. Матвееў, намеснікамі сакратара партбюро выбраны тт. Міхайлоўская і Абезгауз.

З. ЛАРЫСАЎ.

НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

Адбыўся справаздачна-выбарны сход у первічнай партарганізацыі промарцелей горада Калінкавіч. Сход прайшоў на высокім узроўні. Комуністы па-дзелавому абмеркавалі справаздачу сакратара партарганізацыі тав. Душчыца, выявілі недахопы ў рабоце, унеслі многа прапаноў па яе паляпшэнню.

Асноўны ўпор у рашэнні схода накіраван на ўзмацненне партыйнага кантролю дзейнасці адміністрацыі.

Сакратаром первічнай партарганізацыі зноў выбран А. Л. Душчыц, намеснікам, таксама ў другі раз, — Б. Мінеевіч.

Л. М. ЯРГІЛІН.

ПЕРШЫЯ ДНІ НАВІГАЦЫІ

Спаборніцтва бацькі і сыноў

— Дынастыя воднікаў.

Так называюць у Днепра-Дзвінскім параходстве сям'ю Івана Нікалаевіча Іпаценка — капітана буксірнага парахода «Пінск».

І сапраўды: тры сыны Іпаценка бараздзяць воды беларускіх рэк. Іван Іванавіч працуе капітанам буйнейшага на Сожскім участку парахода «В. Ульянов»; Нікалай Іванавіч служыць першым памочнікам капітана парахода «Байкал»; Міхаіл Іванавіч — капітанам газахода № 12, курсіруючага на Пінскай лініі.

Сям'я воднікаў чэснай працай, любоўю да справы і веданнем яе заваявала сабе пачот і павагу ў параходстве. Старшаму яе прадстаўніку—бацьку—пераваліла ўжо за шосты дзесятак. У такія годы час аддаецца законнаму адпачынку. Але не такі Іван Нікалаевіч!

— Вы не глядзіце на мае 62 годы,— з хвацкім запалам заўважае ён,—я ведаю Беразіну, як свае пяць пальцаў, і перад маладымі не падкачаю. Няхай угоняцца за мной!

Капітан праў. Ён сапраўды вывучыў капрызнае русло ракі. Працуе на ёй з дзіцячага ўзросту. Пачаў з плытагона, і вось ужо 22 годы—на гасадзе камандзіра парахода. Ды як працуе! Усякаму суднаводзіцелю можна павучыцца ў Івана Нікалаевіча лоўкасці, спрытнасці, уменню падтрымліваць у камандзе бездакорную дысцыпліну.

Гатымі-ж якасцямі вызначаюцца і сыны старога капітана.

Зараз палаводдзе—гарачая пара навігацыі. Пакінуўшы прычалы затонаў, судны вышлі на фарватар. Трэба больш плённа скарыстаць дні высокай вады, неабходна дабіцца выканання рэйсавых заданняў—вось якія пытанні хвалююць зараз Івана Нікалаевіча ў Бабруйску, яго сыноў—у Гомелі, Пінску.

І вось, ад імені сваёй каманды, бацька выклікае сыноў па соцыялістычнае спаборніцтва. Капітан бярэ на сябе абавязацельства датэрмінова выканаць навігацыйны план.

«Я ўжо стары, — піша ён у пісьме сынам, — але спадзяюся, што ў рабоце спраўлюся з вамі».

Іван Іванавіч справай адгукнуўся на выклік бацькі: у першым-жа рэйсе па Лоеў параход «В. Ульянов» выканаў свой план на 166 процантаў.

В. ШЫЛОЎСКІ.

Лесасплаўшчыкі перавыконваюць нормы

МАЗЫР, 23 красавіка. (Па тэлефону). У перадмайскім соцыялістычным спаборніцтве сплаўшчыкі Прыпяцкай канторы паказваюць выдатныя ўзоры работы. На першым месцы—Лельчыцкі сплаўучастак. Заданне апошняй дэкады ён выканаў больш чым на 120 процантаў, пусціў у сплаў 35.000 кубаметраў драўніны. Першай пачала сплаў брыгада Ігната Чубчыка. Члены гэтай брыгады — 70-гадовы старык Пракоп Лісіцкі і яго сыны Іван і Андрэй выконваюць норму вязкі лесу на пад'ёмах больш чым на 400 проц. Брыгада Глушкавіцкага падучастка (брыгадзір тав. Марковіч) выконвае заданне больш чым на 250 процантаў. На Убораускім падучастку брыгады тт. Васіля і Канстанціна Дземідовічаў за перавыкананне норм па сплаву лесу атрымалі прэміі-надбаўкі.

Сезонныя брыгады калгаса «Шлях соцыялізма», Лельчыцкага раёна, за 5 дзён сплавілі па Жмурэнскаму каналу да ракі Уборці 3000 кубаметраў лесаматэрыялаў.

С. БАЧУРА.

Сказалася „якасць" рамонту

Раней іншых у Днепра-Дзвінскім басейне ачысцілася ад ільду рака Прыпяць. 4 красавіка ў раёне Пінска пачалі навігацыю параходы «Коммунист», «Ванда Василевская» і «Днепр», газаходы №№ 105 і 103. К 6 красавіка Прыпяць ачысцілася ад ільду на ўсім сваім працяжэнні. Зараз-жа з Чарнобыля на Кіеў выйшаў параход «Белорусс», услед за ім—параход «Х лет Октября».

Усе-ж астатнія параходы не змаглі выйсці з Чарнобыльскага затона з-за адсутнасці вугалю. Кіраўнікі прыстані (пам. тав. Корпун) і завода (тав. Васільеў) не забяспечылі дастаўку паліва з чыгуначнай станцыі. Суднам прышлося чакаць, пакуль даставяць вугаль водным шляхам. Такім чынам, 4 самых буйных на Прыпяці параходы («Кренкель», «Командир», «Энгельс» і «Карл Маркс») прастаялі два дні.

Ужо ў першыя дні навігацыі не абышлося без аварый. Параход «Минск» пашкодзіў прабны вал, ва ўрочышчы Салішча параход «Роза Люксембург» наскочыў на затоплены пантон, атрымаў 10 прабоін. Пасажырскі параход «ХХ лет Октября» пры сустрэчы з баржамі пашкодзіў абшыўку.

Баржа № У-2 ля прычала прыстані Пхоў, яшчэ не прыняўшы ні адной тоны вугалю, пачала тануць. Сказалася «якасць» рамонту. А між тым, прадстаўнік механіка-суднавай службы параходства тав. Марковіч і намеснік начальніка прыстані Пхоў тав. Школьнікаў прынялі яе ў эксплаатацыю з здавальняючай адзнакай. Баржа № 801 таксама ледзь не затанула, хоць і яна прынята ў эксплаатацыю тойжа камісіяй. На выпраўленне дэфектаў зараз патрэбуецца не менш месяца.

В. СІДОРКА,
нам. адказнага рэдактара газеты «Беларускі фарватар».

Абавязацельствы і сапраўднасць

У пачатку студзеня на абласной нарадзе работнікі Вілейскай канторы лесасплаву абавязаліся падрыхтавана сустрэць адкрыццё навігацыі.

Дырэктар Вілейскай канторы лесасплаву Артынскі падпісаў абавязацельства да справы і спакойна адседжваўся ў сваім кабінеце. Праз некаторы час загадам Наркомлеса БССР ён быў перавезен у другую вобласць. Дырэктарам сплаўканторы назначылі т. Фрэнкеля, яго намеснікам т. Пігулеўскага.

Пасля змены кіраўніцтва прайшоў значны час, але належнага зруху ў падрыхтоўцы да сплаву не відаць. Набор рабочай сілы праходзіць марудна. План зімовай сплоткі, загатоўкі гужбы і прута не выканан.

Абком партыі і выканком абласнога дэпутатаў працоўных у гэтым годзе па сваіх пасяджэннях два разы слухалі справаздачы кіраўнікоў Абласплаўканторы аб падрыхтоўцы да сплаву і прымалі адпаведныя пастановы. Але карысці пакуль што мала. Падрыхтоўчыя работы да сплаву толькі разгортваюцца, прычым зусім марудна і неарганізавана.

Пісьмы ў рэдакцыю

НАЛАДЗІЦЬ ВЫПУСК КОРМАЗАПАРНІКАЎ

У большасці калгасаў Лагойскага раёна Мінскай вобласці адсутнічаюць кормазапарнікі, саломарэзкі і іншыя кормапрацоўчыя машыны. Абліза абмяжоўваецца толькі тым, што кожны год патрабуе ад раёнаў вестак аб колькасці нехапаючых машын. Сабраўшы весткі, абліза прышле іх да справы і на гэтым лічыць сваю місію закончанай.

Некалькі год назад мінскія станкабудаўнічыя заводы выпускалі кормазапарнікі. Даўно ўжо выпуск іх спынен. А між тым, справа гэта ўжо не такая складаная. Вытворчасць кормазапарнікаў трэба аднавіць. Яны прынясуць немалую карысць калгасам, ладуць магчымасць прадуктыўна і эканомна расходваць корм.

П. ВОРАНАВА,
старшы зоатэхнік Лагойскага райза.

РЫХТУЮЦЦА ДА ІСПЫТАЎ

Настаўнікі і вучні Вялікапольскай НСШ, Чэрвеньскага раёна, старанна рыхтуюцца да веснавых іспытаў. Вучні паўтараюць пройдзены матэрыял. На бацькоўскіх сходах абмеркавана пытанне наконт дапамогі вучням рыхтаваць хатнія заданні. Настаўнікі старшых класаў дапамагаюць настаўнікам малодшых класаў лепш падрыхтавацца да іспытаў. Падбіраецца матэрыял для пісьмовых работ, складаюцца білеты.

Адначасова школа рыхтуецца да раённай алімпіяды дзіцячай мастацкай самадзейнасці. Актыўна працуюць харавы, драматычны і іншыя гурткі.

А. І. АДАХОЎСКІ,
настаўнік Вялікапольскай НСШ.

ПАДТРЫМАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ РЫБАКОЎ

Уступіўшы ў соцыялістычнае спаборніцтва з рыбалоўнай арцеллю «Стаханавец», наша Гаранская арцель ім. Сталіна заняла першае месца ў сістэме Нарачанскага рыбпрамгаса. План першага квартала арцель выканала на 153,6 процанта. Перадавікамі з'яўляюцца рыбакі Жураўлёў Ф. І., Іванец М. О., Драгун В. М. і другія, якія перавыконвалі дзённыя нормы ў паўтара-два разы.

Зараз арцель уключылася ў перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва. Рыбакі гараць жаданнем перавыканаць сваё заданне. Большасць з іх перавыконвае дзённыя нормы ў два разы і больш. Аднак, ініцыятыву рыбакоў не падтрымліваю Нарачанскі рыбпрамгас (дырэктар тав. Озераў). Ён не ўзначальвае соцыялістычнае спаборніцтва паміж арцелямі і асобнымі рыбакамі, не забяспечвае іх сецямі і іншымі рыбалоўнымі прыладамі.

Г. ЖУРАЎЛЁЎ,
старшыня рыбарцелі імені Сталіна.

СКАРЫСТАЦЬ КОЖНАГА СПЕЦЫЯЛІСТА ПА НАЗНАЧЭННЮ

Пытаннем падрыхтоўкі спецыялістаў для нашай народнай гаспадаркі партыя і ўрад удзяляюць выключную ўвагу.

У рэспубліцы зараз ёсць 26 вышэйшых навучальных устаноў, у якіх к пачатку 1940—1941 вучэбнага года вучылася 17,3 тыс. студэнтаў. За годы існавання совецкай улады вышэйшыя навучальныя ўстановы БССР падрыхтавалі 22.110 спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з каранная мясцовага насельніцтва, якому доступ да вышэйшай асветы быў раней фактычна закрыт. У 1940 годзе ў БССР, у розных галінах народнай гаспадаркі і культуры працавала 19,1 тыс. чалавек з вышэйшай асветай, у тым ліку інжынераў 3,4 тыс. чалавек, педагогаў—7,6 тыс. чалавек, урачоў—3,6 тыс. чалавек, агранамаў і зоатэхнікаў—1,6 тыс. чалавек.

Гэты шматлікі атрад совецкай інтэлігенцыі з'яўляецца вялікай сілай у гаспадарчым будаўніцтве, у барацьбе за далейшае развіццё культурнай рэволюцыі. Задача заключаецца ў тым, каб кожны спецыяліст скарыстоўваўся з найбольшай карысцю для краіны, каб яму былі створаны ўсе ўмовы для росту, найбольш поўнага прымянення ўсіх здольнасцей і ведаў на сваім участку работы.

Між тым, у скарыстанні спецыялістаў назіраюцца вялікія недахопы і прабелы.

Вось некаторыя даныя. Па-за сельскай гаспадаркай працуе 293 агранамы і 1 зоатэхнік. Гэта складае каля 20,5 проц. усёй наяўнасці спецыялістаў па данай галіне. Звыш 300 юрыстаў таксама працуюць не па сваёй спецыяльнасці, у той час як за 4 апошнія годы выпушчана ўсяго толькі 350 юрыстаў. З 289 інжынераў-меліяратараў у сельскай гаспадарцы працуе толькі 180 чалавек, а астатнія скарыстоўваюцца на такіх участках, якія не маюць ніякіх адносін да меліярацыі.

Справа даходзіць да таго, што спецыялісты скарыстоўваюцца проста наперакор усякаму здароваму сэнсу. Так, у сістэме Наркомасветы БССР працуе 6 інжынераў-землеўпарадчыкаў, 49 агранамаў і зоатэхнікаў і 44 юрысты. У сістэме Наркомлегпрома БССР знаходзіцца 29 юрыстаў і т. д.

Якім-жа чынам спецыялісты асядаюць на выпадковых работах і ў сілу гэтага дэкваліфікуюцца?

Гэта, перш за ўсё, параджаецца недахопамі ў справе размеркавання студэнтаў, канчаючых вышэйшую школу. З фармальнага боку сістэма размеркавання як быццам забяспечвае правільнае скарыстанне выпускнікоў. Увесь кантынгент размяркоўваецца адпаведным наркаматам, назначэнне кожнага з іх афармляецца загадам па наркамату. Але ў тым вось і бяда, што праверкай выканання гэтых загадаў ніхто амаль не займаецца. Падпісана—і з плеч далоў. А на практыцы даволі часта студэнт-вышускнік ідзе на зусім іншую работу, пры гэтым нярэдка не па сваёй спецыяльнасці, толькі-б асесціца ў горадзе.

На жаль, нямала яшчэ ў нас добрых дзядзькоў, якія патураюць падобным справам і ахвотна пакідаюць у сябе на рабоце тых, хто па совецкіх законах, кончыўшы вышэйшую школу, абавязан працаваць па сваёй спецыяльнасці па назначэнню.

Можна прывесці нямала фактаў, калі выпускнікі вышэйшай школы скарыстоўваюцца не па назначэнню нават у тым-жа самым наркамаце, які іх размяркоўвае, а часта ад гэтых-жа наркаматаў можна чуць скаргі на недахопы спецыялістаў.

Але «ўцечка» спецыялістаў адбываецца не толькі ў першы перыяд пасля сканчэння ВНУ. Асяданне выпускнікоў на выпадковай рабоце не па сваёй спецыяльнасці адбываецца, так сказаць, перманентна. Гэтаму спрыяе дзяляцкі, вузкаведамственны падыход да падбору кадраў, які наглядаецца яшчэ сям-там у нашых арганізацыях і сведчыць аб нежаданні лічыцца з агульнадзяржаўнымі інтарэсамі.

У бягучым годзе ў рады совецкай інтэлігенцыі БССР уліваецца новы атрад спецыялістаў з вышэйшай асветай у колькасці 3086 чалавек, сярод якіх 476 інжынераў, 560 урачоў, 1560 педагогаў, 239 агранамаў і зоатэхнікаў. Гэта—вялікая сіла, якая пры правільным скарыстанні можа многае даць для прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры і асветы. Трэба рашуча забараніць наркаматам пасылаць спецыялістаў на іншыя работы. Іх размеркаванне павінна быць праведзена ў поўнай адпаведнасці з задачамі, высунутымі тав. Маленковым на XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі.

«У адносінах маладых, канчаючых ВНУ, спецыялістаў неабходна ўстанавіць такі парадак, каб кожны, хто скончыў вышэйшую навучальную ўстанову, атрымліваў вытворчы вопыт на прадпрыемстве, праходзіў у абавязковым парадку стаж практычнай работы—памочніка майстра, майстра, інжынера ў цэху».

У пастановах партыі і ўрада не раз падкрэслівалася задача ўстанаўлення правільных суадносін паміж спецыялістамі, якія працуюць непасрэдна на вытворчасці і ў апаратах наркаматаў, трэстаў і заводакіраўніцтвах. Між тым і ў гэтых адносінах у нашай рэспубліцы наглядаецца многа ненармальнасцей.

Даволі ўказаць, што з 1296 інжынераў, якія ў сучасны момант знаходзяцца ў 11 наркаматах БССР, непасрэдна на вытворчасці ў прамысловых прадпрыемствах працуе ўсяго толькі 158 чалавек, або 12,2 проц., у заводакіраўніцтвах гэтых-жа прадпрыемстваў працуе 188 чал., або 14,5 проц., а астатнія 841 інжынер працуюць у апараце наркаматаў, трэстаў, праектных арганізацыях і т. д. На аднаго інжынера даных прадпрыемстваў прыходзіцца 1,2 інжынера, якія працуюць у заводакіраўніцтвах.

У сістэме НКМясцпрома БССР толькі 70 інжынераў або 18,9 проц. ад агульнай колькасці працуе на прадпрыемствах, 92 чал. або 24,8 проц. — у заводакіраўніцтвах і 208 чал., або 56,2 проц. знаходзяцца у апараце Наркамата, трэстаў і навучальных установах.

У сістэме Наркамлеса БССР непасрэдна па вытворчасці у промпрадпрыемствах знаходзіцца толькі 19.7 проц. інжынераў і 21,2 проц. — па лесазагатоўках. У Наркамаце харчовай прамысловасці з агульнага ліку інжынераў з вышэйшай адукацыяй непасрэдна на прадпрыемствах знаходзіцца 27,8 проц., у Наркамаце паліва — 21,7 проц., у Наркамаце будаўнічых матэрыялаў — 21.0 проц. і т. д.

Прыведзеныя лічбы гавораць аб наяўнасці буйных недахопаў у скарыстанні спецыялістаў. Наркаматы абавязаны прыняць самыя рашучыя меры, каб практычна выканаць дырэктывы XVIII партканферэнцыі ў галіне ўзмацнення тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасцю і забяспечыць правільную расстаноўку інжынерна-тэхнічных сіл.

Некалькі заўваг аб падрыхтоўцы спецыялістаў. У спенах ВНУ студэнту неабходна прывіваць любоў да сваёй прафесіі, да вытворчасці, жаданне ведаць гэту вытворчасць дасканала, выхоўваць у яго пачуццё прафесіянальнай гордасці, жаданне цалкам прысвяціць сябе служэнню той справе, да якой ён рыхтуецца.

Асобна аб педагагічных кадрах. Пытанне падрыхтоўкі гэтай катэгорыі спецыялістаў для пачатковай школы ў нас, у рэспубліцы, у асноўным вырашана. Найбольш актуальнай астаецца задача падрыхтоўкі і правільнага скарыстання выкладчыкаў 5—10 класаў.

У 1941 годзе педагагічныя ВНУ выпускаюць 1560 настаўнікаў з вышэйшай асветай. За лік гэтага кантынгента спецыялістаў неабходна камплектаваць 8—10 класы і смела замяняць людзей, працуючых зараз у гэтых класах і не маючых неабходнай асветы і практычных ведаў.

У справе забеспячэння школ педагагічнымі кадрамі з вышэйшай асветай вялікарную ролю адыгрывае завочнае абучэнне. Па рэспубліцы ў завочных педагагічных ВНУ вучыцца 5975 чалавек. На студзеньскую сесію з'явілася 5125 чалавек. Гэта наглядна паказвае, як вялікая цяга да вучобы.

Задача заключаецца ў тым, каб усямерна паляпшаць пастаноўку завочнага абучэння, не дапускаць адсева.

Гаворачы аб завочным абучэнні, нельга не адзначыць, што гэта справа ў БССР па сутнасці абмяжоўваецца сеткаю завочных педагагічных навучальных устаноў.

Назрэла пытанне аб расшырэнні завочнай асветы і ў іншых галінах падрыхтоўкі кадраў. У першую чаргу гэта адносіцца да завочнай эканамічнай асветы, бо патрэбнасць у эканамістах велізарная.

Выпускі Інстытута народнай гаспадаркі далёка не задавальняюць попыту на планавікоў і эканамістаў. Каля 25 проц. планава-эканамічных работнікаў нашых устаноў і прадпрыемстваў маюць вышэйшую асвету, а астатнія з'яўляюцца практыкамі. Было-б вельмі карысна адкрыць пры Інстытуце народнай гаспадаркі завочнае аддзяленне.

Выключнае значэнне набывае зараз задача падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў-меліяратараў. Для ажыццяўлення грандыёзнага плана меліярацыі ўжо ў 1941 — 42 гг. будзе патрэбна каля 400 інжынераў-меліяратараў і гідрамеліяратараў. У аспекце 15-гадовага плана меліяратыўных работ гэта патрэбнасць узрастае ў велізарных размерах.

У пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот у БССР намечан рад мерапрыемстваў па забеспячэнню рэспублікі кадрамі спецыялістаў па меліярацыі і эксплаатацыі асушальных сістэм. Так, пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце ў 1941 годзе павінна быць адкрыта аддзяленне па падрыхтоўцы аграмеліяратараў са штогодным наборам 60 чалавек. Пры мінскім Політэхнічным інстытуце адкрываецца аддзяленне для падрыхтоўкі гідратэхнікаў сярэдняй кваліфікацыі з наборам не менш 100 чалавек. Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум рэарганізуецца ў тэхнікум па падрыхтоўцы меліяратараў. Аднак трэба яшчэ раз падкрэсліць, як неадкладную задачу, зварот усіх спецыялістаў меліярацыі на работу па сваёй спецыяльнасці.

Пытанне аб правільным скарыстанні спецыялістаў усіх кваліфікацый мае вялікае значэнне для паспяховага выканання важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Б. Н. ПАПОЎ,
нач. аддзела культуры і навукі Дзяржплана пры СНК БССР.
С. А. НЕХАЙ,
нач. аддзела падрыхтоўкі кадраў Дзяржплана пры СНК БССР.

ПАЛІ ПАДСЫХАЮЦЬ, А СЕЯЦЬ НЕ СПЯШАЮЦЦА

ЛОЕУ. (Спец. кар. «Звязды»). У калгасе імені Сталіна зямлі многа. Толькі яравы клін займае больш 700 гектараў. Работы многа, асабліва вясной.

Палі калгаса размешчаны на высокім беразе Дняпра і хутка падсыхаюць. Калгаснікам прыходзіцца адначасова падкармліваць і баранаваць азімыя, вывозіць гной, сеяць канюшыну, яравыя. Людзі працуюць дружна. 70 пар валоў і коней заняты на рабоце.

На полі працуе толькі адзін трактар, 3 астатнія стаяць на калгасным дварэ. Каля аднаго з іх тупаюць брыгадзір Сямён Позняк і трактарыст Нікалай Крамар.

Сямён Позняк, трымаючы ў руках адвёртку, павольна круціць яе, прыціраючы клапан.

— Чаму прыцірку не зрабілі ў часе рамонту?

— Відаць паленаваліся, — абыякава адказвае Позняк.

Другі трактар на чарзе. У ім таксама будуць чысціць галоўкі блока і прыціраць клапан.

— Механік тут быў?

— Чаго яму тут бываць. Лепш каля майстэрні прагуляецца.

— Дык вы без дазволу рамантуеце?

— А навошта дазвол, калі машына не працуе.

— Вы ўжо прабавалі араць?

— Выязджалі. Месцамі можна працаваць, але наскрозь трактар яшчэ не можа прайсці.

Як відаць, тт. Позняк і Крамар не спяшаюцца.

Кіраўнікоў МТС (дырэктар тав. Зайцаў) не асабліва турбуе гэта, бо яны самі прытрымліваюцца той мысліі, што яшчэ рана пачынаць работу. Гэтая пазіцыя чакання каштуе калгасу вельмі дорага.

Сваімі сіламі калгас падрыхтаваў 85 гектараў, а засеяў толькі 14. Такі разрыў паміж сяўбой і зрывам атрымаўся таму, што не працуюць трактары і стаяць сеялкі.

Сёлета ўпершыню калгас пачаў масавую падкормку і баранаванне азімых. Старшыня калгаса Іван Анісавец гаворыць аб гэтым, як аб вялікім дасягненні.

Аказваецца, што рассяваюць суперфасфат нядбайна, валяецца многа нераспёртых кавалкаў. У 4-й брыгадзе барануюць азімыя так, што большасць слядоў ад бараны ідзе ўздоўж радкоў сяўбы.

Як трактарам, так і валамі ў калгасе араць мелка. Веснавое ворыва праводзіцца на глыбіні 8—10 сантыметраў.

Так абстаяць справы ў калгасе, які ў раёне лічыцца ў радзе перадавых.

У калгасе «Чырвоны сцяг» узарана 150 гектараў, а пасеяна ўсяго 45. Дні ні ў калгас прыехаў галоўны аграном райземадзела Фёдар Харлап.

Першае, што сказаў яму старшыня калгаса тав. Савёнак,—была просьба:

— Дазволь мне, тав. Харлап, пасеяць авёс уручную. Нешта наша сеялка няспраўная, ды і круціцца з ёю — толькі час траціць.

— Гэтага мы нікому не дазваляем, — прамовіў т. Харлап пасля некаторага раздум'я.—Але табе можна дапамагчы. Сей, бадай, толькі не давай разгону.

Аграном абыйшоў маўчаннем і той факт, што ў калгасе ігнаруюць культывацыю зяблевага ворыва.

Большасць калгасаў не давяла насення да патрэбнай кандыцыі па чыстаце. Засяваюць палі неачышчаным насеннем калгасы «Чырвоны партызан», імені «XI з'езда Советаў», «17 Кастрычнік» і інш. Ды і што гаварыць аб арпелях, калі райземадзел сам вызеліў калгасам 85 цэнтнераў ільнонасення неэдпаведнай кандыцыі.

Па даных кантрольна-насеннай лабараторыі, яшчэ не даведзена да патрэбнай кандыцыі 2.995 цэнтнераў насення аўса, 1.592 цэнтнеры ячменю, 158 цэнтнераў ільнонасення. Пры такіх адносінах да элементарных правіл агратэхнікі нельга заваяваць высокія ўраджаі.

І. НОВІК.

Сяўбу правесці быстра і добра

У радзе сельсоветаў Мінскага раёна калгаснікі выбарачным парадкам пачалі палявыя работы.

Калгаснае сялянства ўступае ў веснавую сяўбу з цвёрдым рашэннем правесці яе ў самыя сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні. Сярод калгаснікаў шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва за высокія ўраджаі.

У гэтым годзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы праведзена значна лепш і арганізаваней. Вясна не застала знянацку. Да сяўбы калгаснікі старанна рыхтаваліся. Вывезлі мінеральныя ўгнаенні, сабралі попел, загатовілі торф.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «І Конная», Новадворскага сельсавета, калгасы імені Леніна і імені Сталіна, Кайкаўскага сельсавета, яшчэ ў сярэдзіне сакавіка закончылі ўсе падрыхтоўчыя перадпасеўныя работы: прывялі ў поўны парадак інвентар, падрыхтавалі да сяўбы насенне, вывезлі на поле гной, устанавілі строгі ўнутраны распарадак.

Калгас «Звязда», Абчацкага сельсавета, заўсёды лічыўся адстаючым. Ураджайнасць была нізкая. Нават элементарныя агратэхнічныя правілы тут не выконваліся.

Зараз зусім іншае. Калі ў мінулым годзе калгас закупіў усяго 12 тон мінеральных угнаенняў, то да веснавой сяўбы гэтага года падрыхтавана 114 тон. За апошнія 10 год усе калгасы Абчацкага сельсавета разам выкарысталі для ўгнаення глебы ў тры разы менш мінеральных угнаенняў, чым завезена толькі для веснавой сяўбы гэтага года. Значна больш накапілі розных угнаенняў калгасы «КІМ», Самахвалаўскага сельсавета, «Комсамолец», Калодзішчанскага сельсавета, імені Варашылава, Ратамскага сельсавета, і іншыя.

Там, дзе кіраўнікі мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый старанна прадумалі ўсе пытанні,—паспяхова праведзена падрыхтоўка да сяўбы.

Вясна ў гэтым годзе капрызная. Улічваючы гэта, мы далі калгасам указанне не чакаць «сапраўднай вясны», а араць, дзе толькі можна. І калгасы пачалі араць на больш высокіх месцах, выбарачным парадкам.

На палях калгасаў Папярнянскага, А.-Гарадзецкага, Ратамскага сельсветаў ужо закіпела дружная работа. Калгаснікі змагаюцца за атрыманне высокіх сталінскіх ураджаяў. Адчуваецца высокая арганізаванасць, небывалы ўздым калгасных мас.

Праўда, ёсць яшчэ і асобныя недахопы. Некаторыя калгасы дрэнна падрыхтаваліся да веснавой сяўбы. Напрыклад, у калгасе «Х з'езд Советаў», Сеніцкага сельсавета, насенныя фонды не ачышчаны. У калгасе «Аб'еднанне», гэтага-ж сельсавета, на поле вывезена толькі 27 проц. неабходнага ўгнаення, 17 проц. торфу. Адстаюць яшчэ калгасы імені ДПУ, Строчыцкага сельсавета, «Свабода», Сляпянскага сельсавета, і некаторыя іншыя.

Вялікую ўвагу партыйныя арганізацыі, кіраўнікі сельсветаў і калгасаў павінны ўжо зараз удзяліць стварэнню ўмоў для калгаспіц-мацярэй, каб яны мелі поўную магчымасць прымаць актыўны ўдзел у калгаснай вытворчасці.

У мінулым годзе ў радзе калгасаў была расхістана працоўная дысцыпліна. Многія жанчыны зусім не выходзілі на работу. Некаторыя калгасы не арганізавалі дзіцячых ясляў. Клопаты аб мацеры—справа чэсці кожнага партыйнага, совецкага і земельнага работніка, кожнага калгаса. Уцягненне ўсіх калгасніц у работу на калгасных палях забяспечыць паспяховае правядзенне пасеўных і іншых сельскагаспадарчых работ.

Калгаснікі раёна абавязаліся ў гэтым годзе асушыць 991 гектар балот, адрамантаваць асушальную сетку на плошчы ў 282 гектары, адвесці павярхоўныя воды з сенажацей на плошчы ў 238 гектараў, расчысціць 581 гектар ад хмызнякоў, правесці раскарчоўку на плошчы ў 267 гектараў.

Задача—немалая і яе трэба паспяхова вырашыць. Гэта дасць дадатковыя рэзервы для павелічэння ўраджайнасці.

У гэтым годзе ўпершыню ў калгасах праводзіцца летняя пасадка бульбы на плошчы каля 500 гектараў. 18 красавіка была праведзена нарада агранамаў, якая распрацавала практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню гэтага задання.

Вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі павінен стаць здабыткам усіх калгаснікаў. За вынікі работы ў 1940 годзе выканком Мінскага абласнога совета зацвердзіў наш раён узлёшнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1941 года.

У 1940 годзе на выстаўцы прымала ўдзел 320 экспанентаў. На 1941 год зацверджана 474 экспаненты.

Задача партыйных арганізацый, кіраўнікоў сельсветаў, калгасаў, усіх калгаснікаў—сяўбу 1941 года правесці ў самыя сціслыя тэрміны і высокаякасна.

Т. ПРАСМЫЦКІ,
сакратар Мінскага РК КП(б)Б.

Многа ранняй гародніны вырашчваюць калгасы Брэсцкай вобласці. На здымку: у калгасе імені Сталіна, Брэсцкага раёна, гароднік А. М. Матвеюк за паліўкай парніковых гуркоў.

Фото В. Лушейкі. (БЕЛТА).

Вінаградарства ў Беластоцкай вобласці

БЕЛАСТОК. (Кар. «Звязды»). Развядзенне вінаграду ў вобласці пакуль не носіць прамысловага характару, тым не менш гэта культура тут вельмі пашырана і дае вялікія ўраджаі. На працягу дзесяткаў год у многіх любіцеляў накапіўся вялікі вопыт па развядзенню вінаграду.

41 год займаецца развядзеннем вінаграду Еўгеній Атаназовіч, які працуе цяпер старшым агранамам Скідзельскага райземадзела. Ён мае 15 кустоў лазняка, з якіх збірае штогод звыш 100 кілограмаў вінаграду. У 1938 годзе, дзякуючы інтэнсіўнай падкормцы расліны, ён сабраў па 16 кілограмаў ягад з кожнага куста.

Гэтымі днямі Беластоцкі абком партыі сабраў нараду вінаградараў-любіцеляў. Абмяркоўвалася пытанне аб магчымасці быстрага развядзення вінаграду ў большых маштабах. Усе ўдзельнікі нарады выказаліся па гэтаму пытанню станоўча. На працягу 3—4 год колькасць плоданосных вінаградных кустоў у вобласці можна давесці да 100 тысяч, а саджанцаў—у многа раз больш. Глебавыя і кліматычныя ўмовы ўпаўне спрыяюць развядзенню вінаграду, тым больш, што на працягу дзесяткаў год у вобласці культывіраваўся марозастойкі сорт, які вытрымаў нават стужы зімы 1939 года.

Пачалася пасадка бульбы ў калгасе «Чырвоны гароднік», Мінскага раёна.

Фото І. Казлоціча.

На калгасных палях

Першымі ў Мінскай вобласці пачалі палявыя работы калгасы Старобінскага раёна. У селгаскарцелі «Цвет Палесся», Краснаворскага сельсавета, пасеяна ўжо 6 гектараў яравога жыта і 10 гектараў аўса. У калгасе «Парыжская комуна», гэтага-ж сельсавета, — 7 гектараў канюшыны.

Дружна пачуў палявыя работы ў Лістападаўскім сельсавеце. Тут калгас «Комінтэрн» засеяў 4 гектары бульбы.

***

БРЭСТ, 21 красавіка. Арганізавана пачалі веснавую сяўбу калгасы Дамачэўскага раёна. За два дні пасеяна 70 гектараў зернавых. Як правіла, большасць калгаснікаў перавыконвае нормы. У калгасе «Вольная праца» выпаў спецыяльны нумар насценнай газеты, у якім расказваецца аб вопыце перадавых брыгад і стаханаўцаў.

Днямі ў раёне арганізаваны два новых калгасы — «Перамога» і «1-ае мая». Маладыя калгаснікі абагулілі сельскагаспадарчы інвентар, рабочую жывёлу і насенне і дружна прыступілі да палявых работ.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Большавік», Пружанскага раёна, засеялі 57 гектараў і падрыхтавалі пад сяўбу 70 гектараў глебы.

***

ВІЛЕЙКА, 23 красавіка. (Кар. «Звязды»). На падсохшых масівах пачаліся палявыя работы. Першымі ў вобласці выйшлі ў поле калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Шлях соцыялізма», Смаргоньскага раёна. 21 красавіка засеяны першыя тры гектары аўса. Усе калгаснікі гэтай арцелі на палявых работах перавыконваюць нормы выпрацоўкі.

***

ОРША, 21 красавіка. (Па тэлефону). Амаль усюды зямля калгасаў аслабанілася ад снегу. Быстра падсыхае глеба. На асобных невялікіх участках зямлі ўжо можна прыступаць да палявых работ, і тут калгасы пачалі веснаўспашку, баранаванне зяблева, пасеў канюшыны, рассеў мінеральных угнаенняў.

20 красавіка на перапашку і культывацыю зяблева ў калгасе «Маяк комуны» выйшлі 2 трактары 5-й брыгады Высоцкай МТС. Машыны працуюць добра. Трактарысты Андрэй і Павел Чарняўскія, Якаў Купава выконваюць вытворчыя заданні.

Пачаліся палявыя работы ў калгасах «Высокая зорка», «Ленінскі прызыў» і «Новы свет», Высоцкага сельсавета. У гэтых калгасах на ўспашцы і баранаванні працуюць 44 кані. Тут-жа рассяваюцца мінеральныя ўгнаенні. У калгасе «Ленінскі прызыў» праведзена падкормка азімай пшаніцы.

Крытыка і бібліяграфія

КАШТОЎНЫ ДАПАМОЖНІК НАСТАЎНІКУ

«Метадычны лісток». Выданне Віцебскага педінстытута імені С. М. Кірава, № 1, 1941 г., стар. 32.

Шматгранная і выключна складаная работа настаўніка. Справу прыходзіцца мець з дзецьмі розных характараў і разумова-фізіялагічных асаблівасцей. Задача выхавальніка—скарыстаць усе магчымасці, метады і прыёмы для фарміравання з школьніка чалавека новага, соцыялістычнага ладу, усебакова развітага, культурнага, пісьменнага, здольнага да працы і абароны радзімы.

Але адных уласных якасцей, здольнасцей і стараннаў настаўніка недастаткова для гэтага. Ён павінен сістэматычна быць у курсе новых выхаваўчых сродкаў, якія прымяняюць лепшыя майстры педагагічнай справы, вывучаць тэарэтычныя абагульненні людзей навуковай мысліі і з усёй сукупнасці новага выбіраць найбольш падыходзячае і карыснае для перанясення ў школу.

Выданы Віцебскім педагагічным інстытутам імені С. М. Кірава зборнік, бясспрэчна, з'яўляецца каштоўным дапаможнікам для настаўнікаў. Калектыў навуковых работнікаў інстытута выбраў найбольш актуальныя пытанні школьнай практыкі—пытанні, звязаныя з прывіццём вучням працоўных навыкаў, арганізацыяй пазакласных мерапрыемстваў і выкладаннем рускай мовы.

Спынімся на артыкуле І. Д. Багрова «Падрыхтоўка вучняў да практычнай дзейнасці пры вывучэнні фізікі ў школе». Асноўная думка аўтара—адмовіцца ад так званай мелавой фізікі, «калі ў выкладанні адсутнічае сувязь тэорыі з практыкай, нагляднасць, вопыты, лабараторныя работы»—пранізвае ўвесь артыкул. Абучэнне неабходна паставіць так, каб вучань атрымліваў моцныя веды, умеў правільна асмысліць кожнае правіла, закон і ведаў, як яны прымяняюцца на практыцы.

Не сакрэт-жа, што яшчэ і зараз многія выпускнікі сярэдняй школы не ведаюць прасцейшых фізічных прыбораў, не ўмеюць карыстацца такімі вымяральнымі прыборамі, як лінейка, рулетка, штангенцыркуль, мікрометр; яны бездапаможны, калі неабходна зрабіць нескладаны рамонт электрычнага ўцюга, прывесці ў дзеянне прымус, паяльную лямпу і т. д.

Вельмі пашыраная з'ява, калі сам выкладчык фізікі і іншых дакладных навук, баючыся лішняй работы, не выкарыстоўваюць маючыяся наглядныя дапаможнікі, лічаць залішнім рабіць «простыя», даўно «вядомыя» вучням вопыты, а часамі проста спасылаюцца на адсутнасць у школе гэтых дапаможнікаў. Між тым «... дынамаметры, прыбор для вывучэння ціску вадкасці на розную глыбіні, злучаныя сасуды, адвес, ватэрпас, нахільную плоскасць, трыбаметр, каларыметры, разрэз паравой машыны, электраскоп, рэастаты, мадэль электрамагнітнага амперметра, мадэль цеплавога амперметра, аптычную скамейку і інш. —зможа зрабіць кожны вучань, які ўладае мінімальнымі навыкамі апрацоўкі дрэва, бляхі, дроту».

У артыкуле ёсць спроба аўтара зрабіць пералік, якія-ж канкрэтна работы па фізічных з'явах павінен умець выканаць вучань VI, VII класаў пяцігадовай сярэдняй школы. Гэта карысна, але многія патрабаванні неканкрэтны, прымітыўны і проста залішні, як аб'ясненне дзеяння нажніц, абцугоў, пласкагубцаў.

Пытанню сувязі тэорыі з практыкай прысвечан артыкул А. І. Радкевіча «Як набудаваць гаспадарку на прышкольным участку». Ён заклікае кіраўнікоў школы, увесь педагагічны калектыў зрабіць пры шырокім удзеле вучняў, вопытны прышкольны ўчастак «жывой лабараторыяй» па курсу батанікі, заалогіі, хіміі, фізікі.

Актуальнасць артыкула зараз, з наступленнем палявых работ, яшчэ больш узрастае: ён вучыць, як арганізаваць гаспадарку на прышкольным участку.

Каштоўныя метадычныя ўказанні для настаўніка-мовазнаўца і некаторы фактычны матэрыял, звязаны з вывучэннем рускай мовы, дае артыкул выкладчыка інстытута М. Е. Ханіна аб нагляданнях над рознымі формамі мовы ў сярэдняй школе.

Сістэматычна і паслядоўна праводзіць гэту работу — неабходнае патрабаванне да кожнага настаўніка-мовазнаўца. Гэта работа дапамагае навучаючымся разбірацца ў тайнэйшых адценках слова, развівае ў іх зацікаўленасць. Важна ўмела падабраць матэрыял, на якім можна было-б даць вучням уяўленне аб багаццях і закономернасцях розных форм рускай мовы, аб яе паходжанні і развіцці.

Артыкул гатаму вучыць. У ім мы знаходзім удалыя наглядзі па фанетыцы. Ён таксама знаёміць з народнай этымалогіяй, з стараславянскімі элементамі і рускімі словаўтварэннямі (град—горох—гражданин; мрак—морочить—омрачать; празд—праздный; прах—порох; влак, волок—облако і т. д.).

Пачынанне інстытута трэба, безумоўна, вітаць. Факт выпуску дапаможніка гаворыць аб тым, што калектыў навуковых работнікаў інстытута аказвае добрую дапамогу настаўнікам сярэдняй школы метадычнымі ўказаннямі. Трэба толькі абмеркаваць пытанне, ці не лепш змяшчаць, у наступных зборніках менш артыкулаў, што дасць магчымасць больш дэтальна распрацоўваць асобныя тэмы. Вельмі карысна было-б, калі-б інстытут больш глыбока вывучаў сярэднюю школу, работу мясцовых майстраў педагагічнай справы і каб навуковыя работнікі на гэтым вопыце будавалі свае матэрыялы. Тады-б у якасці прыкладаў добрай работы па сувязі тэорыі з практыкай не патрэбна было-б браць выкладчыкаў толькі з другіх гарадоў, як гэта робіць тав. А. І. Радкевіч. Майстры-педагогі ёсць-жа і ў Віцебскай вобласці.

Зборнік не пазбаўлен стылістычных і моўных пагрэшнасцей. Сустракаюцца такія выразы: «соцыялістычная грамада», «рамесніцкіх і чыгуначных вучылішч», «неблагапалучна».

Пры ўсіх недахопах зборнік карысны і акажа дапамогу настаўнікам сярэдняй школы.

А. МІНЬКОЎ.

МАТЭМАТЫЧНАЯ АЛІМПІЯДА

Фізіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта праводзіць цікавае мерапрыемства — матэматычную алімпіяду. Мэта алімпіяды — выявіць найбольш адарованых юных матэматыкаў, развіваць цікавасць школьнікаў да матэматыкі.

Арганізацыйнае бюро алімпіяды правяло нядаўна сход школьнікаў гор. Мінска, прысвечаны гэтаму пытанню. Доктар матэматычных навук Маскоўскага ордэна Леніна Дзяржаўнага універсітэта імені Ламаносава І. М. Гельфанд прачытаў для іх даклад на тэму «Паняцце аб множствах», дацэнт Белдзяржуніверсітэта Г. Н. Сагаловіч — «Звёздчатыя многавугольнікі».

У фізіка-матэматычным корпусе Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбыўся першы тур алімпіяды. Удзельнічала 44 вучні IX і X класаў 16 школ гор. Мінска і студэнты тэхнікума сувязі. Былі прапанаваны тэксты пасці задач па арыфметыцы, алгебры, геаметрыі і трыгаманетрыі. (Па гэтых-жа тэкстах у адзін і той-жа час адбылася традыцыйная сёмая матэматычная алімпіяда школьнікаў гор. Масквы).

Падвезены вынікі алімпіяды. 22 чалавекі заваявалі права ўдзельнічаць у другім і апошнім туры матэматычнай алімпіяды. Найбольшы лік удзельнікаў (8 чалавек) алімпіяды быў ад 4-й сярэдняй школы гор. Мінска. Усе яны дапушчаны ўдзельнічаць у другім туры.

„Я абвінавачваю"

У № 3 журнала «Интернациональная литература» друкуецца пераклад нядаўна вышаўшай у Амерыцы кнігі Андрэ Сімона «Я абвінавачваю». Падзагаловак кнігі «Тыя, хто здрадзіў Францыі» раскрывае змест запісак Андрэ Сімона.

Пад псеўданімам А. Сімона выступае вядомы французскі журналіст, які блізка назіраў палітычнае жыццё Францыі апошніх 7—8 год.

Друкуем у вытрымках апошні раздзел кнігі, які рысуе абстаноўку ў Францыі перыяда вайны.

Зараз лічыцца амаль аксіомай, што Францыя пацярпела паражэнне іменна з-за сваёй слепой веры ў лінію Мажыно. Мне гэта сцвярджэнне праставляецца далёкім ад праўды. Самая лінія Мажыно, магчыма, не такая ўжо дрэнная,—фатальным аказаўся «дух Мажыно», пароджаны ёю.

Я маю на ўвазе тое, што французскі генеральны штаб разлічваў у першую чаргу на бетонныя ўмацаванні лініі, а не на людзей, прызначаных для іх абароны. Гаворыць, што французскі генеральны штаб рыхтаваўся ў 1940 годзе паўтарыць вайну 1914 года. І сапраўды, французская ваенная стратэгія не прымала ў разлік тых грандыёзных перамен, якія адбыліся за мінуўшыя дваццаць год.

Але справа не ў тым толькі, што французскі генеральны штаб не ўяўляў сабе патрабаванняў, прад'яўляемых сучаснай вайной да тэхнікі, і, у прыватнасці, недаацэньваў ролю авіяцыі і танкаў. Аднак гэтага недастаткова, каб аб'ясніць дзіўнае паражэнне Францыі. У чым французскія генералы разам з французскімі дзяржаўнымі дзеячамі абанкроціліся зусім, дык гэта ў ацэнцы палітычнага фактара.

Францыя ўступала ў вайну расколатай зверху ланіжу. Яна была расчленена і самой вайной і тымі акалічнасцямі, што былі перад ёю. Адзін відны германскі ваенны тэарэтык пісаў, што ў вайне патрэбна пры ўсіх акалічнасцях унікаць пытання: «З-за чаго вайна?» Але амаль увесь французскі народ к пачатку ваенных дзеянняў настойліва патрабаваў адказу на гэта пытанне. Гэта пытанне чыталася ў поглядах салдат, якія ішлі на фронт, мацярэй, жон і сясцёр, у роспачы махаўшых на развітанне рукой, пакуль поезд не скрываўся ў далечы.

Палітычныя дзеячы, на плечы якіх лягла задача ўсяляць у людзей упэўненасць, аказаліся не ў сілах з гэтай задачай справіцца. Ды ні магло быць інакш? Гэта былі тыя самыя людзі, якія сваімі промахамі і папусціцельствам паралізавалі дух народа. Урад заяўляў: «Адзінства ў такі час — прамая неабходнасць». Але ён сам быў расколат. Газеты запаўнялі першыя полосы захваленнямі небывалай мужнасці, праяўляемай французскім народам. Але на другой старонцы яны прадаўжалі ранейшыя ўзаемныя абвінавачанні, спрэчкі і грызню.

Якое-ж магло быць адзінства? Адзінства не ласягаецца пустымі размовамі. Яно ўзнікае вакол вялікай ідэі, вакол неабходнасці. Народ не адчуваў у гэтай вайне ні гаго, ні другога. Барацьба за дэмакратыю? Гэты лозунг страціў сваю прывабнасць для большасці народа — ва ўсіх-жа на вачах «дэмакратыя» ўжывалася са здрадніцтвам і бясчэсцем.

Германія вельмі добра ўлічвала гэтыя настроі.

Калі пачалася вайна, разлажэнне ўжо пранікла ў сэрца Францыі. Французскі бастыён быў падорван знутры раней, чым быў захвачан праціўнікам.

***

Вайна Францыі з Германіяй пралаўжалася дзесяць месяцаў. Дзесяцімесячную кампанію можна разбіць на пяць перыядаў. Яны змяняюць адзін аднаго няўмольна, нібы акты грэчаскай трагедыі.

Першы перыяд ахапляе час ад пачатку вайны да падзення Варшавы. Ён цягнуўся дваццаць сем дзён верасня.

За гэтыя першыя чатыры тыдні вайны Францыя быстра прывыкла да ўведзеных абмежаванняў. Запямненні ператварылі «горад святла» ў горад цемры. Першыя паветраныя трывогі прайшлі без якіх-небудзь сур'ёзных вынікаў. У маёй маладой суседкі, служыўшай у міністэрстве калоній, пачалася істэрыка, калі ўпершыню загулі сірэны. Але большасць жанчын спакойна аставалася на сваіх месцах, надзеўшы процівагазы. Ужо пры трэцяй трывозе завыванне сірэны ўспрымалася як нешта звычайнае. Ніхто не пужаўся і не ўпадаў у паніку. Спачатку мы ўсе таскалі з сабою процівагазы, і нават ганарыліся імі, як ваеннай адзнакай. Паступова яны зніклі.

Французская армія аспярожна прасоўвалася ў Саарскай вобласці па «нічыёй зямлі» і па мініраванай тэрыторыі. Стады свіней высылаліся ўперад арміі, каб абезпасіць мінае поле. Газеты паведамлялі, што гэта прасоўванне французаў прымусіла Германію перакінуць шэсць дывізій з польскага фронта на лінію Зігфрыда. Але ім там не давялося ўступіць у бой: за выключэннем некалькіх дробных сутычак не адбылося ні адной значнай сутычкі паміж французскімі і нямецкімі войскамі. За гэты-ж перыяд у Францыю прыбылі першыя англійскія часці.

Далад'е, разумеецца, рэарганізаваў свой кабінет. Парэйце, з вялікім спазненнем Жорж Баннэ быў выдалены з міністэрства замежных спраў. Далад'е ўзяў і гэты партфель сабе. Баннэ перайшоў у міністэрства юстыцыі.

Каля сярэдзіны верасня мой рэдактар атрымаў праўдзівыя весткі аб тым, што Баннэ стварыў салідны фонд, прызначаны для вядзення кампаніі за пагашэнне з Германіяй. Гэты рух узначальваўся двума групамі палітычных дзеячоў. Каля пятнаццаці дэпутатаў групіравалася вакол Гастона Бержэры і Марселя Дэа. Чалавек трыццаць іншых парламентарыяў сфарміравалі другую групу вакол былога прэм'ера Лаваля і Андрыена Маркэ, дэпутата і мэра Бардо. Баннэ з'яўляўся звязваючым звяном паміж абодвума групамі.

Першыя два пасяджэнні Вярхоўнага ваеннага совета адбыліся ў гэты пачатковы перыяд вайны. Чэмберлен у суправаджэнні некалькіх сваіх міністраў сустрэўся з Далад'е «недзе на тэрыторыі Францыі». Прэм'ер-міністры рашылі прадаўжаць наступленне французскай арміі на заходнім фронце з мэтай адцягнуць нямецкія сілы ад усходу, але ўнікаць пры гэтым усякага рыска. Чэмберлен гаварыў аб труднасцях правядзення мабілізацыі ў Англіі з-за адсутнасці абучаных афіцэраў і спаражэння для новых войск. Была дасягнута згода адносна ўступак Італіі з мэтай аддалення яе ад Германіі. Вярхоўны ваенны совет рашыў таксама каардынаваць дзеянні французскай і англійскай армій на Бліжнім Усходзе і падрыхтаваць іх да «магчымага канфлікта» з Совецкім Саюзам. Генерал Вейган атрымаў званне камандуючага французскімі сіламі ў Сірыі.

Пакуль польская кампанія падыходзіла к канцу, Далад'е не губляў часу: ён раіўся з генеральным штабам і міністрам унутраных спраў Альберам Сарро аб мерах па барацьбе з комуністамі. Адзін з памочнікаў Далад'е расказаў мне, што Далад'е пры абмеркаванні гэтага пытання ўступіў у заўзятую спрэчку з генералам Гамеленам. Гамелен пярэчыў талы супроць роспуску комуністычнай партыі. Ён лічыў, што кожны дзесяты чалавек у арміі — комуніст і што падобны акт можа выклікаць шырокае незадаваленне нават сярод тых салдат, якія не сімпатызіравалі комуністам. Ён баяўся пагоршання маральнага стану войск, але ўрэшце падначаліўся волі Далад'е. Сарро ў спрэчках падтрымліваў прэм'ера. Комуністычная партыя была абвешчана па-за законам.

Варшава пала. У той-жа дзень французскія войскі пачалі адступаць з «нічыёй зямлі», куды яны часткова прасунуліся. Яны адступалі да лініі Мажыно.

***

Наступны этап пралаўжаўся ўвесь кастрычнік і лістапад.

За гэтыя месяцы французскія газеты, за выключэннем нямногіх, сталі адкрыта называць рускіх «ворагам нумар адзін». Германія была разжалавана на другое месца. Адзін член брытанскага парламента сказаў мне на адным сходзе ў Парыжы: «Чытаеш французскую прэсу — і ствараецца ўражанне, нібы Францыя ваюе з Расіяй, а з немцамі знаходзіцца толькі ў напягнутых адносінах».

У кастрычніку быў канчаткова падпісан франка-англійска-турэцкі пакт аб узаемадапамозе.

На ўнутраным фронце былі выданы новыя дэкрэты, усклаўшыя агромныя цяжары на працоўныя масы, у першую чаргу на рабочых. Гэта выклікала сур'ёзныя беспарадкі па заводах. Пры гэтым не было ўведзена ніякіх новых палаткаў на прыбыткі ваеннай прамысловасці.

Марсель Дэа, які апублікаваў лістоўку з патрабаваннем неадкладнага і безумоўнага міру, быў дапытан следчым і адпушчан. Праз некаторы час справа супроць яго была спынена.

Былы член выканаўчага камітэта соцыялістычнай партыі прафесар Зарэцці распаўсюджваў у кулуарах парламента і ў розных рэдакцыях выкрываўчае пісьмо. Зарэцці быў выключан з соцыялістычнай партыі за тое, што прабаваў праз аднаго швейцарскага соцыяліста пабудзіць П Інтэрнацыянал выступіць з прапановай аб мірных перагаворах. Ціпер Зарэцці даказваў, што Поль Фор быў звязан з ім у гэтай справе і ў сваю чаргу знаходзіўся ў песным кантакце з Лавалем.

Але Фор і Лаваль пралаўжалі аставацца ларадпамі Далад'е.

Лістапад пачаўся новай трывогай. Разносліся чуткі аб тым, што нямецкія арміі збіраюцца заняць Галандыю і Бельгію. Адпойчы каля пяці гадзін раніцы мяне разбудзіў званок з міністэрства замежных спраў, адтуль паведамлялі, што ўтаржэнне ў Галандыю пачалося ўжо. Але пакуль што гэта была хлуслівая трывога. Па маёй думцы, чуткі аб падыходзячым нападзе на Галандыю былі адным з прыёмаў «вайны на нервах». Калі-ж пачыналіся сапраўдныя падзеі, яны нязменна заставалі Францыю знянацку.

Ва ўрадзе адносіны паміж прэм'ерам Далад'е і міністрам фінансаў Рэйно былі напружаны да крайнасці.

Суперніцтва гэтых двух людзей шкодна ўплывала на работу кабінета.

Палата дэпутатаў пачала праяўляць прызнакі моцнага непакою. Адны групы з вялікай нервовасцю адзначалі бязрэзнасць французскай арміі. Другія скарысталі гэты факт як аргумент на карысць міру. У сенацкай камісіі па замежных справах Лаваль прадпрыняў адну з сваіх вылазак: ён накінуўся на ўрад за недастаткова энергічныя спробы дагаварыцца з Італіяй. Але калі яго прыяцель Поль Балдэн вярнуўся з Рыма з пустымі рукамі, Лаваль патрабаваў разрыву дыпламатычных адносін з Расіяй. Ён знайшоў сабе саюзнікаў у газетах «Тан», «Журналь дэ дэба», «Матэн» і іншых. Гэта агітацыя вялася з неймавернай заўзятасцю і дасягнула свайго вышэйшага пункта к моманту пачатку ваенных дзеянняў у Фінляндыі.

***

Трэці перыяд вайны адзначан самай разнузданай антысовецкай кампаніяй.

Хутка пасля пачатку канфлікта ў Фінляндыі французскія і англійскія дыпламаты з рантоўна абуджанай энергіяй узяліся за работу ў Жэневе. Расія была выключана з Лігі нацый.

Дзве парламенцкіх групы (Бержэры і Лаваля) энергічна напісалі на Далад'е, прымушаючы яго аб'явіць вайну Расіі. Яны разлічвалі, што гэта дазволіць ім шырока разгарнуць антысовецкі крыжовы паход.

Генерал Вейган быў выклікан у Парыж для абмеркавання «бліжне-ўсходніх прыгатаванняў». Другі французскі генерал быў паслан у Фінляндыю ў якасці ваеннага кансультанта. Самалёты і танкі рыхтаваліся да адпраўкі ў Хельсінкі. На працягу трох месяцаў у Францыі ўсімі спосабамі падтрымлівалася ўпэўненасць, што фіны могуць пратрымацца на працягу года або нават выйграць вайну супроць Совецкай Расіі!..

Пал Новы год французскае вярхоўнае камандаванне апублікавала заспакойваючае паведамленне, што лінія Мажыно дапоўнена новымі ўмацаваннямі і падоўжана па бельгійскай граніцы да самага мора.

Аднак у палітычных кругах усё больш нарастала нездавальненне супроць французскага вярхоўнага камандавання. Раздаваліся скаргі на тое, што Гамелен недастаткова энергічна вядзе вайну. Яго абвінавачвалі ў залішняй асцярожнасці, у баязні наступальных дзеянняў.

У палаце прадаўжаліся спрэчкі. У кулуарах многія дэпутаты не скрывалі свайго нездавальнення Далад'е. Патрабаванне склікання закрытага пасяджэння парламента заваёўвала ўсё больш прыхільнікаў. «Калі Далад'е выступіць перад закрытым пасяджэннем сената, — сказаў мне Жаненэ, — ён не атрымае і сотні галасоў»

(Працяг будзе)

З а р у б я ж о м

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(Дзённік ваенных дзеянняў)

Адступленне англійскіх і грэчаскіх войск на грэчаскім фронце прадаўжаецца. Як паведамляе агенцтва Стэфані, у зводцы італьянскага камандавання гаворыцца, што грэчаскія эпірская і македонская арміі здаліся. Асноўныя баі, згодна зводкі германскага камандавання, разгортваюцца вакол Фермапільскай пясніны (на поўдзень ад Ламіі). У зводцы грэчаскага камандавання адзначаецца, што адыходы грэчаскіх войск на новыя тылавыя пазіцыі зроблен без сур'ёзных перашкод з боку праціўніка. Грэчаская авіяцыя і зенітная артылерыя нанеслі сур'ёзныя страты германскай авіяцыі, прадаўжаўшай развіваць актыўную дзейнасць.

Спецыяльны карэспандэнт агенцтва Трансопэан, што знаходзіцца з германскай арміяй у Грэцыі, паведамляе аб упорных баях, якія адбываліся паміж германскімі войскамі і новазеландскімі часцямі ў часе прасоўвання германскай арміі да Ларысы. Новазеландскія войскі, піша карэспандэнт, занялі добра ўмацаваныя і выдатна замаскіраваныя горныя пазіцыі, якія было вельмі цяжка вывяць у гарыстай мясцовасці. Новазеландскія войскі, прадаўжае карэспандэнт, абараняліся з вялікім уменнем і жорсткасцю. Нават раненыя новазеландскія салдаты прадаўжалі весці агонь з процітанкавых гармат. Толькі пасля жорсткага бою гэты горны праход быў узят, і праціўнік быў вымушан адступіць.

Адзначаецца таксама актыўная дзейнасць авіяцыі ў Сярэдняй і Паўднёвай Грэцыі. Згодна паведамлення грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспекі, германскія самалёты некалькі разоў бамбардыравалі раёны Пірэя, Элеўсіна, Метары і Атыкі. У паведамленні Германскага інфармацыйнага бюро гаворыцца, што германская авіяцыя зрабіла рад інтэнсіўных налётаў на аэрадромы ў Грэцыі і на востраве Крыт.

Спыняючыся на актуальным становішчы ў Грэцыі, англійскае міністэрства інфармацыі дае кароткі агляд аперацый англійскай арміі ў Грэцыі. У пачатку германскага наступлення англійскія войскі займалі абарончыя пазіцыі, ішоўшыя з паўночнага захада на паўднёвы ўсход праз Эдэсу (Вадэна). Калі германскія войскі прарваліся праз югаслаўскія абарончыя лініі і ўступілі ў Грэцыю праз Бітольскі праход, стварылася пагроза для тылу як англійскай, так і грэчаскай армій. У сувязі з гэтым для грэчаскіх часцей, якія апынуліся супроць італьянцаў і займалі пазіцыі, ішоўшыя на паўднёвы захад ад Тэсалоніке, узнікла неабходнасць адвесці свой правы фланг да албанскай граніцы. Адначасова англійская армія павінна была адвесці свой левы фланг на лінію абароны, праходзячую праз гару Олімп. З прычыны вялікіх цяжкасцей манеўравання і захавання камунікацый, а таксама з прычыны жорсткага характару германскага наступлення, аказалася немагчымым утрымаць пазіцыі, ішоўшыя праз гару Олімп. Новыя пазіцыі, занятыя англійскімі войскамі, праходзілі на поўдзень ад плато Ларысы, а ў апошнія некалькі дзён англійскія войскі адступілі праз Ларысу на поўдзень да Ламіі і занялі новыя пазіцыі. Абарончая лінія, утрымліваемая ў сучасны момант англійскімі войскамі, карацей той лініі, якую яны займалі раней.

* * *

На англа-германскім фронце дзейнічалі, галоўным чынам, ваенна-паветраныя сілы ваюючых старон. Вялікія злучэнні германскіх бамбардыроўшчыкаў, паведамляецца ў зводцы германскага камандавання, у ноч на 23 красавіка зноў зрабілі налёт на Плімут. Бамбардыроўцы падверглісь верфі і базы снабжэння англійскага ваенна-марскога флота. Апрача таго, германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі порт Портсмут і партовыя збудаванні на паўднёва-ўсходнім і паўднёва-заходнім узбярэжжы Англіі, а таксама на ўсходнім узбярэжжы Шатландыі. Прадаўжаліся аперацыі германскіх узброеных сіл на моры. Паведамляецца аб патапленні і пашкоджанні некалькіх англійскіх гандлёвых параходаў.

У тую-ж ноч, перадае агенцтва Рэйтэр, англійскія самалёты зрабілі налёт на Брэст.

* * *

У Паўночнай Афрыцы ваенныя дзеянні адбываліся ў Кірэнаіцы. Згодна італьянскай зводкі, англійскія часці зноў адкавілі вылазкі з Тобрука, але былі адбіты італа-германскімі войскамі. Англійская авіяцыя рабіла налёты на апорныя пункты італа-германскіх войск у Кірэнаіцы.

Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на аўтарытэтныя англійскія ваенныя круги, сцвярджае, што ў ноч на 20 красавіка невялікая група англійскіх войск высадилася ў Бардыі. Ёю разбуран важны мост і падпалены склады з ваенным снаряжэннем. Далей у паведамленні гаворыцца, што асноўнай групе англійскіх войск удалося вярнуцца назад.

Ва Ўсходняй Афрыцы ваенныя аперацыі разгортваюцца, згодна італьянскай зводкі, у сектары Дэсі (на паўночны ўсход ад Аддыс-Абебы). Карэспандэнт агенцтва Рэйтэр таксама перадае, што баі паміж англійскімі і італьянскімі войскамі адбываюцца на подступах да Дэсі, дзе італьянцы аказваюць упорнае супраціўленне.

23 красавіка. (ТАСС).

ВАЙНА НА БАЛКАНАХ І Ў АФРЫЦЫ

(Агляд ваенных дзеянняў з 15 па 22 красавіка)

Цэнтрам ваенных дзеянняў мінулага тыдня па-ранейшаму з'яўляліся Балканы. Аперацыі вялікага маштаба, якія адбываліся ў Югаславіі, скончыліся 18 красавіка капітуляцыяй югаслаўскай арміі. Адной з асноўных прычын яе паражэння з'явілася безумоўная перавага праціўніка і ў першую чаргу ў ваеннай тэхніцы. Германская і італьянская авіяцыя ў многа разоў пераўзыходзіла па колькасці, а таксама і ў якасных адносінах югаслаўскую. Заваяваўшы без асаблівай цяжкасці панаванне ў паветры, германа-італьянская авіяцыя падвергла бесперапынным бамбардыроўкам усе важнейшыя прамысловыя цэнтры краіны, аэрадромы, чыгуначныя вузлы, масты і дарогі, па якіх адбываўся рух войск, у рэзультаце дзеянняў авіяцыі праціўніка югаслаўскае галоўнае камандаванне было пазбаўлена магчымасці своечасова рабіць адпаведныя перагрупіроўкі войск. Разбурэнне ліній сувязі ўнутры краіны таксама затрудняла кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі. Вядома, што ўжо на чатверты дзень вайны камандуючы югаслаўскай арміяй генерал Сімовіч быў вымушан прадаставіць права асобным камандзірам дзейнічаць па свайму погляду. Гэта акалічнасць была выклікана таксама дзеяннямі германскіх мотамеханізіраваных часцей, якія прарваліся ў тыл 3-й арміі, знаходзіўшайся ў паўднёвай частцы краіны і страціўшай сувязь з галоўным камандаваннем. Германскім бронетанкавым дывізіям і італьянскім матарызаваным часцям з югаслаўскага боку процістаялі не больш 3—4 танкавых батальёнаў і некалькі бронетанкавых дывізіёнаў. Германскім мотамеханізаваным часцям удалося адрэзаць Югаславію ад Грэцыі. Германскія мотамеханізіраваныя часці на працягу першых жа дзён вайны захапілі важнейшы ваенна-прамысловы раён Югаславіі — Ніш, Крагуевац, Белград, што, безумоўна, адбілася на снабжэнні югаслаўскай арміі боепрыпасамі і ўзбраеннем.

Апрача гэтых аперацый, дзеянні германскіх мотамеханізаваных войск былі накіраваны на расчляненне югаслаўскай арміі. Гэтага яны дабіліся, фарсіраваўшы раку Саву і заняўшы Сараева.

Якія-ж прычыны, дазволіўшыя германскім і італьянскім мотамеханізаваным часцям так быстра і глыбока прасоўвацца ў тыл югаслаўскай арміі? Гэта ў першую чаргу аб'ясняецца адсутнасцю дастатковых умацаванняў на ўсходніх межах Югаславіі. Паводле вестак замежнага друку югаслаўскі генеральны штаб лічыў найбольш небяспечным паўночныя аперацыйныя напрамкі, якія ішлі з Германіі і Венгрыі; таму ўмацаваныя раёны будаваліся ў першую чаргу на паўночных межах. Асноўная лінія абароны праходзіла па паўднёвых берагах рэк Савы і Дуная. Як відаць з ходу ваенных дзеянняў, гэты план югаслаўскага камандавання выконваўся больш або менш пасляхова. Наступленне германскіх войск з Венгрыі і Германіі развівалася марудна, і процістаянне іх на поўдзень было моцна затрымана фартыфікацыйнымі збудаваннямі і абараняючымі іх югаслаўскімі войскамі.

Пры вялікай працяжнасці дзяржаўных граніц югаслаўскі генеральны штаб не змог адначасова ўмацаваць усе граніцы і, у прыватнасці, югаслаўска-балгарскую, якая альтэрнатыва выключна важную ролю ў данай вайне. Як відаць, даліны горных рэк Струміцы і Брэгальніцы, а таксама адзіныя шляхі з Балгарыі на Скопле і Ніш не былі перагароджаны і абсталяваны ў процітанкавых адносінах. Апульная канфігурацыя граніц Югаславіі дала магчымасць яе праціўнікам весці канцэнтрычнае наступленне і стварыць пагрозу акружэння ўжо ў пачатку вайны.

Пасля капітуляцыі югаслаўскай арміі становішча грэчаскіх войск пагоршылася. Германскія войскі, маючы ў сваім саставе альпійскія часці, узмоцненыя бронетанкавымі злучэннямі і падтрымліваемыя авіяцыяй і артылерыяй, на працягу некалькіх дзён вялі жорсткія атакі на грэка-англійскія абарончыя пазіцыі. Асноўны абарончы рубеж саюзнікаў праходзіў па горных хрыбтах уздоўж даліны ракі Вістрыцы і заканчваўся ля Салонікскага заліва на гары Олімп. Галоўны ўдар германскіх войск быў накіраван у цэнтр грэка-англійскай абароны і ў выпадку поспеху ствараў пагрозу акружэння грэчаскіх войск, якія знаходзіліся ў Албаніі. Баі ў раёне гары Олімп і за пераправы праз раку Вістрыцу насілі найбольш жорсткі характар. Аднак, германскія войскі, карыстаючыся сваёй перавагай, прарвалі фронт абароны саюзнікаў і, абыходзячы гару Олімп з захаду, занялі Ларысу—важнейшы вузел чыгуначных і шасейных дарог, якія вядуць у Фесалійскую раўніну. Грэчаскае камандаванне своечасова ўлічыла пагрозу свайму леваму флангу, і грэчаскія войскі, якія знаходзіліся ў Албаніі, былі вывезены з Грэцыі. Паградзец, Корча, Клісура і Аргіракастрон былі заняты італьянцамі без бою. Не гледзячы на гэты манеўр, які звужае лінію фронта, становішча грэка-англійскіх войск астаецца сур'ёзным. Прарваўшыяся ў Фесалійскую раўніну германскія мотамеханізаваныя часці, развіваючы наступленне на Ламію і далей на поўдзень, будуць бесперапынна ствараць пагрозу акружэння грэчаскім войскам, якія знаходзяцца ў Эпірэ — захопнай частцы Грэцыі. Са стратай плацдарма ў Паўночнай Грэцыі англійскае камандаванне наўрад ці рызыкне перакідкай новых часцей у Пелапанес—на поўдзень Грэцыі, тым больш, што наступленне германскіх бронетанкавых дывізій у Кірэнаіцы стварыла новую пагрозу Егіпту. Апошні-ж з'яўляецца важнейшай ваеннай базай Велікабрытаніі ва ўсходняй частцы Міжземнага мора і прыкрывае Суэцкі канал—важнейшую камунікацыю англійскага марскога флота.

На працягу апошняга тыдня германскія і італьянскія мотамеханізаваныя часці прабавалі зламіць супраціўленне асаджанага гарнізона ў Тобруку. Аднак, апошні, карыстаючыся падтрымкай англійскага ваенна-марскога флота і авіяцыі, не толькі адбіў усе атакі праціўніка, але і наладжвае вылазкі. Аазіс Джаравуб прыкрывае некаторыя сілы немцаў і з'яўляецца памехай пры далейшым наступленні ў Егіпет. Англійскае камандаванне спешна перакідвае войскі з Абісініі, не гледзячы на працягваючыяся яшчэ там ваенныя дзеянні. Італьянскія войскі, якія асталіся ў Абісініі і знаходзяцца ў безнадзейным становішчы, адмаўляюцца капітуляваць, імкнучыся затрымаць перакідку англійскіх войск у Егіпет. Трэба мяркаваць, што ў бліжэйшым будучым барацьба за ўсходнюю частку Міжземнага мора прыме яшчэ больш жорсткі характар.

Маёр Е. СОСНІН.

ХАРЧОВЫЯ ЗАТРУДНЕННІ Ў ВЕНГРЫІ

БУДАПЕШТ, 23 красавіка. (ТАСС). Як паведамляюць газеты, у асобных камітатах Венгрыі харчовае становішча абвастрылася да такой ступені, што ўлады вымушаны ўжываць выключныя меры. Так, напрыклад, урадавая газета «Мад'яроршаг» піша, што з 18 красавіка ў камітаце Камаром (Верхняя Венгрыя) прыступілі да работы рэквізіцыйныя камісіі. Камісіі праводзяць вобыскі ў кожным доме. Усе лішкі прадуктаў, перавышаючыя норму, згодна распараджэння ўрада канфіскуюцца. Гэта мера датычыць запасаў мукі, зярна, сала, бабоў, гароху і чачавіцы.

ПАВЕЛІЧЭННЕ КОЛЬКАСЦІ АМЕРЫКАНСКАЙ АРМІІ

НЬЮ-ЙОРК, 23 красавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, начальнік штаба амерыканскай арміі генерал Маршал заявіў у сенацкай камісіі па абследванню выканання праграмы ўзбраенняў, што ўрад прыступіў ужо да павелічэння колькасці амерыканскай арміі да памераў ваеннага часу. У сучасны момант амерыканская армія налічвае 1.250 тысяч чалавек. Далей Маршал заявіў, што 2 месяцы таму назад ЗША былі вымушаны рашуча перагледзець свае планы, паколькі дагэтуль недастаткова ўлічваліся некаторыя новаўвядзенні ў германскай армі. Зараз ваеннае міністэрства адкрыла 4 школы для падрыхтоўкі кадраў механізіраваных часцей. Кожная школа будзе падрыхтоўваць у 3 месяцы 12.000 чалавек.

Начальнік мабілізацыйнага аддзела ваеннага міністэрства генерал Туодл заявіў, што армія «гатова да вайны хоць заўтра, калі гэта спатрэбіцца», не гледзячы на некаторыя недахопы ва ўзбраенні і падрыхтоўцы. Туодл заявіў таксама, што ваеннае міністэрства закончыла распрацоўку плана павелічэння колькасці амерыканскай арміі да 2.800 тыс. чалавек, калі канграс дасць на гэта сваю згоду.

ПРЫЁМ ГІТЛЕРАМ ЧЫАНО

БЕРЛІН, 22 красавіка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае паведамленне з Вены, у якім гаворыцца, што 20 красавіка Гітлер прыняў у прысутнасці Рыбентропа італьянскага міністра замежных спраў Чыано. Пасля перагавораў, якія Чыано вёў у Вене з германскім міністрам замежных спраў, ён выехаў сёння ў другой палавіне дня ў Італію.

ЦУДЗРОС—ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ГРЭЦЫІ

АФІНЫ, 22 красавіка. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што грэчаскі кароль назначыў прэм'ер-міністрам Эмануэля Цудэроса, міністра замежных спраў, які прыняў прысягу. Састаў кабінета астаўся без змяненняў.

Сцэна з VIII карціны п'есы В. Гусева «Слава» ў пастаноўцы Брэсцкага Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра. Артыстка Е. Н. Неверава ў ролі маёры, В. Н. Мураўёў у ролі Мядзведзева, артыстка В. І. Парусова ў ролі Наташы.

Фото Б. Дынкіна.

Культурнае абслугоўванне сплаўшчыкаў

Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза работнікаў лесу і сплава намеціў рад мерапрыемстваў па культурнаму абслугоўванню сплаўшчыкаў у бягучым сезоне.

На ўчастках будуць працаваць спецыяльныя гукавыя кінаперасоўкі. Брыгады сплаўшчыкаў на астаноўках змогуць праглядзець лепшыя мастацкія фільмы. Рад самадзейных калектываў рыхтуе цікавыя канцэртныя выступленні на ўчастках. Калектыў мастацкай самадзейнасці ў Петрыкаве рыхтуе п'есу «Платон Крэчэт», калектыў мастацкай самадзейнасці ў Бярэзіне — «Любоў Яравая», калектыў Рагачоўскага камітэта саюза лесу і сплава — рад песень і плясак.

На новыя землі

РАГАЧОЎ. (Кар. «Звязды»). Спецыяльным поездам у Краснаярскі край выехала група калгаснікаў Гомельскай вобласці.

З Журавіцкага раёна выехала звыш 40 чал. Сярод перасяленцаў—лепшыя стахановы тт. Пачкоў (калгас «Іскра», Іскапскага сельсовета), Бацманаў (калгас імені Леніна, Балатнянскага сельсовета), якія выпрацавалі за мінулы год звыш 1000 працадзён кожны; калгаснікі селыгасарцелі «Араты», Балатнянскага сельсовета тт. Кухарэў і Міхайлаў, якія выпрацавалі па 779 працадзён.

Для ўсіх перасяленцаў, як заявіў вашаму карэспандэнту інструктар Новасёлкаўскага РК КП(б)Б Краснаярскага края тав. Пахаркоў, падрыхтаваны дамы, прадукты. Ён чакаюць багатыя землі Краснаярскага края.

Зводка Наркамзема БССР

аб ходзе выканання плана сяўбы яравых па БССР на 20 красавіка 1941 г.

ОБЛАСЦІ	Усяго пасеяна яравых: У гектарах	Усяго пасеяна яравых: У проц. да плана.
Гомельская вобласць	3001	1,2
Мінская вобласць	896	0,2
Палеская вобласць	27926	15,9
Баранавіцкая вобласць	314	0,2
У тым ліку калгасамі:	246	1,0
Віцебская вобласць	6455	1,5
У тым ліку калгасамі:	1185	5,2
Брэсцкая вобласць	14722	6,5
У тым ліку калгасамі:	1202	11,2
Пінская вобласць	14748	14,9
У тым ліку калгасамі:	1112	14,4

Справаздачна-эканамічны аддзел Наркамзема БССР.

БЕЛАРУСКАЯ ССР—ЛІТОЎСКАЯ ССР

(Таварыскі матч па барацьбе і боксу)

Камітэт па справах фізкультуры і спорта пры СНК БССР звярнуўся да Камітэта па справах фізкультуры і спорта пры СНК Літоўскай ССР з прапановай правесці таварыскі матч па барацьбе і боксу паміж зборнымі камандамі абодвух рэспублік.

Старшыня Камітэта па справах фізкультуры і спорта пры Соўнаркоме Літоўскай ССР тав. Шыманас прыслаў пісьмо аб згодзе правесці гэту таварыскую сустрэчу. Каманды літоўскай ССР ужо ўкамплектаваны і 27 красавіка выязджаюць у Мінск. У саставе каманд увайшлі 14 мацнейшых барцоў і баксёраў розных ватавых катэгорый—тт. Бендзеліс, Лензінас, Русецкас, П. Вільчынскас, Сегаліс, Унтопас, Біргерыс, Міхалоўскіс, Вістрынас, І. Вільчынскас, Дробініпас, Дайновецас, Дзеркоўскіс і Рамановічус.

Літоўскія баксёры сустрэнуцца на рынгу з вопытнымі баксёрамі Беларусі — майстрамі спорта СССР тт. Чэрнаброўкіным і Осіпавым і тт. Якубовічам, Ягцэравым, Панасюком, Кудрыным і Федэрманам.

Вялікую цікавасць прадставіць таксама сустрэчы па барацьбе, у якіх выступяць абсалютны чэмпіён рэспублікі па барацьбе майстар спорта СССР т. Мірскі, майстры спорта СССР браты Іосілевічы і лепшыя барцы тт. Клепкі, Майзельс, В. Чулікі і Чаусаў.

МАЙСТРЫ МАСТАЦКАГА ТКАЦТВА

БЕЛЬСК. Беластоцкі абласны Дом народнай творчасці арганізаваў у Бельску эксперыментальную майстэрню мастацкага ткацтва. Пад кіраўніцтвам мастака Ф. Манцэвіча ў майстэрні працуюць ткачы С. Гапановіч, С. Нічыпарук, М. Варабей і С. Жабінская.

Выдатным майстрам мастацкага ткацтва з'яўляецца селянін Бельскага раёна тав. Гапановіч. Ён ужо шырока вядомы па сваёй рабоце—габелену (мастацкі насценны кавёр) з партрэтам таварыша Сталіна. Зараз тав. Гапановіч разам з тав. Нічыпаруком заканчвае работу над габеленам з партрэтам Наркома Абароны Маршала і Героя Совецкага Саюза С. Т. Тімашэнка і прыступае да работы над новым вялікім габеленам з партрэтам правадыра народаў таварыша Сталіна.

Тт. Варабей і Жабінская выткалі прыгожы габелен з партрэтам Маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава.

Паведамленне

24 красавіка, у 8 гадзін вечара, у 18 аўдыторыі Дома партыйнай асветы, аддзел прапаганды і агітацыі Мінскага гаркома КП(б)Б арганізуе кансультацыю для дырэктараў прадпрыемстваў і начальнікаў цехаў па тэме: «Сабекошт прамысловай прадукцыі і шляхі яго зніжэння».

Кансультацыю праводзіць прафесар Манаў.

Адказны рэдактар М. К. АСТАПЕНКА.

Даяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета БССР
24 красавіка
ЧЫО-ЧЫО-САН
Пачатак у 8 г. веч.
Бліжэйшая прэм'ера
КАЗКІ ГОФМАНА

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага чырвонага сцяга драматычны тэатр
24 красавіка
ФЛАНДРЫЯ
Пачатак у 8 г. веч.

Кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
БАГДАН ХМЕЛЬНІЦКІ
Пачатак у 5.15, 7.15, 9.15 і 11 г. веч.

Кінатэатр «РОДИНА»
ДЗЯЎЧЫНА З ТАГО БЕРАГА

Дзіцячы кінатэатр
Дзённыя сеансы
ПАМЫЛКА ІНЖЫНЕРА КОЧЫНА
Сеансы для старшых школьнікаў
«ГРОЗА»
Пачатак у 5 і 7 г. веч.
Вячэрнія сеансы для дарослых
«ЗАКЛЮЧЕННЫЕ»

Кінатэатр «СПАРТАК»
Казукова-папулярны фільм «Сібір совецкая»; фільм-песня «Бывайце здаровы»; фільм-песня «Марш Першай конай».

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
24 красавіка
ЗАКАЛДАВАНЫ КРАВЕЦ
Пачатак у 8 г. веч.

АКРУГОВЫ ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЗахАВА
ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР
24 красавіка
ЦЫГАНСКІ БАРОН
Пачатак у 8 г. вечара

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ
КАНЦЭРТНЫ ЗАЛ
(рог. вул. Урыцкага і Карла Маркса, 21/13).
26, 27, 28 і 29 красавіка.
АНСАМБЛЬ ПЕСНІ І ТАНЦА
ЧЫРВОНАСЦЯЖНАГА БАЛТЫЙСКАГА ФЛОТА
(Талін).
Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — прафесар В. О. НАХУЦІН
Пачатак у 9 г. вечара.
Білеты ў касе канцэртнага зала з 12 да 2 дня і з 5 да 9 г. веч.
Прымаюцца заяўкі на культпаходы.

Мінскі дзяржаўны педагагічны і настаўніцкі інстытут імені А. М. Горкага
аб'яўляе НАБОР СТУДЭНТАЎ
НА 1941/42 ВУЧЭБНЫ ГОД

НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ:

1. ФАКУЛЬТЭТ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ (беларускае і рускае аддзяленні)—рыхтуе выкладчыкаў па беларускай і рускай мовах і літаратуры для сярэдняй школы, педвучылішч і тэхнікумаў.
2. ГІСТАРЫЧНЫ — рыхтуе выкладчыкаў па гісторыі для сярэдняй школы, педвучылішч і тэхнікумаў.
3. ПЕДАГАГІЧНЫ (школьнае і дашкольнае аддзяленні) — школьнае аддзяленне рыхтуе выкладчыкаў педагогікі для педвучылішч, кіруючых работнікаў і школьных метадыстаў аддзелаў народнай асветы: дашкольнае аддзяленне рыхтуе выкладчыкаў педагогікі і методыкі для дашкольных педвучылішч і кіруючых педработнікаў — метадыстаў па дашкольнаму выхаванню.
4. ФАКУЛЬТЭТ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ (дзённы і вячэрні) мае нямецкае, англійскае і французскае аддзяленні — рыхтуе выкладчыкаў па нямецкай, англійскай і французскай мовах для сярэдняй школы, педвучылішч і тэхнікумаў.

Тэрмін навучання на гэтых факультэтах — 4 гады, а на вячэрнім — 5 год.

НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ:

1. Факультэт мовы і літаратуры (беларускае і рускае аддзяленні) — рыхтуе выкладчыкаў для няпоўнай сярэдняй школы па беларускай і рускай мовах і літаратуры. Ёсць вячэрняе аддзяленне.
2. Факультэт замежных моў (нямецкае і англійскае аддзяленні) — рыхтуе выкладчыкаў для няпоўнай сярэдняй школы па нямецкай і англійскай мовах.

Тэрмін навучання ў настаўніцкім інстытуце — 2 гады, а на вячэрнім аддзяленні — 3 гады.

У педагагічны інстытут прымаюцца асобы, маючыя закончаную сярэднюю асвету, а ў настаўніцкі — не ніжэй 9 класа ў сярэдняй школы, ва ўзросце ад 17 да 35 год у педагагічны інстытут і ад 17 да 40 год у настаўніцкі інстытут.

Паступаючыя ў інстытут падвяргаюцца ўступным экзаменам па наступных прадметах:

а) У педінстытут — па рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры, гісторыі народаў СССР геаграфіі і па адной з замежных моў (нямецкай, англійскай, французскай) па выбару паступаючага.

Паступаючыя на гістарычны і педагагічны факультэты па замежнай мове іспытаў не здаюць:

б) У настаўніцкі інстытут — па рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры, гісторыі народаў СССР і геаграфіі. Паступаючыя на аддзяленне замежных моў дадаткова здаюць іспыты па замежнай мове і аслабаняюцца ад здачы геаграфіі.

Скончыўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) з атэстатам выдатніка прымаюцца ў інстытут (дзённы, настаўніцкі і вячэрні) без уступных экзаменаў.

Гэта права пашыраецца і на скончыўшых сярэднюю школу на выдатна ў парадку эксэрната.

УВАГА: 1. Выдатнікі, паступаючыя на факультэт замежных моў педінстытута трымаюць дадатковы экзамен па замежнай мове;

2. Праграмы ўступных іспытаў ёсць у месцовых аддзяленнях КОГІЗ'а.

Прыём заяў аб залічэнні ў інстытут з 20 чэрвеня па 1 жніўня, а на вячэрняе аддзяленне — з 10 мая па 25 чэрвеня.

Прыёмныя іспыты — з 1 па 20 жніўня, а на вячэрняе аддзяленне з 1 па 10 ліпеня.

Паступаючыя ў інстытут падаюць заяву на імя дырэктара з прыкладаннем наступных дакументаў: падрабязнай аўтабіяграфіі, атэстата аб сканчэнні сярэдняй школы (ў арыгінале), трох фотакартак (без галаўнога ўбора), даведкі аб стане здароўя, даведкі аб адносінах да воінскага абавязку (для ваенна-абавязаных). Пашпарт прадъяўляецца асабіста.

У заяве трэба ўказаць, па які факультэт і спецыяльнасць паступае і дакладны адрас паступаючага.

Настаўнікі школ, паступаючыя ў інстытут, павінны прадставіць згоду аблАНА аб водпуску на вучобу.

На ўступныя экзамены з'яўляцца па выкліку. У час экзаменаў паступаючыя на дзённыя аддзяленні забяспечваюцца інтэрнатам.

Залічаныя ў інстытут і маючыя патрабу ў жыллёвым забяспечваюцца інтэрнатам (члены сямі інтэрнатам не забяспечваюцца).

АДРАС ІНСТЫТУТА: г. Мінск, вул. Карла Маркса 31-а, II паверх, пакой 28. Тэлефон 2-42-97.

ДЫРЭКЦЫЯ.

МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ
ДА ПЕРШАМАЙСКАГА СВЯТА
У МАГАЗІНЫ МІНГОРПРАМГАНДЛЯ
пастуціў рознастайны асартымент тавараў:
ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ
МУЖЧЫНСКАЕ, ДАМСКАЕ І ДЗІЦЯЧАЕ.
ДЛЯ МУЖЧЫНСКАГА І ДАМСКАГА ТУАЛЕТА
ГАЛЬШТУКІ, ЧУЛКІ ДАМСКІЯ, НАСКІ, СУМАЧКІ І ІНШ.
ГАЛАЎНЫЯ УБОРЫ
МУЖЧЫНСКІЯ ФЕТРАВЫЯ ШЛЯПЫ, КЕПІ, ДАМСКІЯ ШЛЯПЫ НАВЕЯШНЫХ ФАСОНАЎ, ДЗІЦЯЧЫЯ ШАПАЧКІ.
ПАРФУМЕРЫЯ
АДЭКАЛОН, ДУХІ, ПУДРА, МЫЛА ТУАЛЕТНАЕ, КРЭМЫ.
МУЗЫКА
МАНДАЛІНЫ, ГІТАРЫ, БАЛАЛАЙКІ, ГАРМОНІКІ, БАЯНЫ, ПАТЭФОННЫЯ ПЛАСЦІНКІ і інш.
ПАСУДНА-ГАСПАДАРЧЬЯ ТАВАРЫ
ЧАЙНЫЯ І СТАЛОВЫЯ СЕРВІЗЫ, ВІННЫЯ ПРЫБОРЫ, РУМКІ, ГРАФІНЫ, СТАКАНЫ.
МЭБЛЯ
ДЫВАНЫ, ШАФЫ, СТУЛЬІ, ЛОЖКІ, МАТРАЦЫ, ЭТАЖЭРКІ.
Асартымент тавараў штодзённа папаўняецца.
ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ з 25 красавіка ЧАС ГАНДЛЮ ў магазінах ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА на 2 гадзіны.
МІНГОРПРОМГАНДАЛЬ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 2-00-00 (камутатар), дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-31-88, адказны сакратар—2-13-53, намеснік адказнага сакратара — 2-13-99, сакратарыят — 2-39-55, аддзелаў: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85, аддзел рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыя выдавецтва і аддзел абмену — 2-08-44, выпускаючы — 2-47-68, карэктарская — 2-13-57

У1926. Друкарня газеты «Звязда». М., Г. Ш.